М. В. Жуковіч

# Літаратурнае чытанне



2

Частка 1

# ПАМЯТКА
# «ЯК НАВУЧЫЦЦА ВЫРАЗНА ЧЫТАЦЬ ТВОР»

1. Уважліва прачытайце твор. Старайцеся ў думках уявіць тое, пра што чытаеце.
2. Вызначце свае адносіны да падзей і персанажаў.
3. Вызначце, якія думкі, пачуцці трэба паведаміць слухачам.
4. Выберыце адпаведны тон і тэмп чытання.
5. Чытайце правільна кожнае слова.
6. Захоўвайце паўзы на месцы знакаў прыпынку (, : ; … — ), паміж абзацамі і часткамі твора.
7. Захоўвайце інтанацыю сказаў (? ! .).
8. Выдзяляйце голасам важныя месцы твора.



***Алена Бархаткова.*** Восень



***Віктар Каралёў.*** Восеньскія бярозкі

# ПАМЯТКА
# «ЯК НАВУЧЫЦЦА ПАДРАБЯЗНА ПЕРАКАЗВАЦЬ ЗМЕСТ ТВОРА»

1. Павольна і ўважліва прачытайце твор.
2. Пазначце яго асноўныя сэнсавыя часткі.
3. Дайце часткам загалоўкі (прыдумайце свае або выберыце сказ з твора). Гэта будзе план тэксту.
4. Загалоўкі запішыце.
5. Загарніце кнігу. Перакажыце ўвесь твор па плане.



***Эдуард Рымаровіч.*** Ціхі вечар



***Віктар Каралёў.*** Лютаўскі дзень

М. В. Жуковіч

# Літаратурнае чытанне

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках

Частка 1

*Дапушчана*
*Міністэрствам адукацыі*
*Рэспублікі Беларусь*

2-е выданне, перапрацаванае і дапоўненае

Мінск

Нацыянальны інстытут адукацыі
2022

Правообладатель Национальный институт образования

УДК 821.161.3.09(075.2=161.3)
ББК 88.3(4Беи)я71
Ж86

Р э ц э н з е н т ы:

дацэнт кафедры сучасных методык і тэхналогій адукацыі дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія паслядыпломнай адукацыі», кандыдат педагагічных навук, дацэнт *І. М. Слесарава*;

метадычнае аб'яднанне настаўнікаў пачатковых класаў дзяржаўнай установы адукацыі «Гімназія № 4 г. Мінска» (настаўнік пачатковых класаў вышэйшай кваліфікацыйнай катэгорыі *Н. П. Краўцова*)

## Умоўныя абазначэнні:



— слоўнік;


— пытанні і заданні да тэкстаў;


— звярніце ўвагу;


— давайце абмяркуем тэму разам;


— папрацуйце ў пары, у групе;


— пафантазіруйце;


— спіс выкарыстаных крыніц.

ISBN 978-985-893-199-5 (ч. 1)
ISBN 978-985-893-198-8

© Жуковіч М. В., 2016
© Жуковіч М. В., 2022, са змяненнямі
© Афармленне. НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2022

Правообладатель Национальный институт образования

# ВЕРАСНЁВЫ ШКОЛЬНЫ РАНАК




**Мы пазнаёмімся** з цікавымі і павучальнымі творамі беларускіх аўтараў пра важнасць старannaй вучнёўскай працы, пра ролю кніг у жыцці чалавека.

**Мы будзем вучыцца:**

- вызначаць у творах дзейных асоб і выказваць свае адносіны да іх;
- вызначаць настрой паэтычных твораў.

**Варта задумацца:**

Навошта дзецям патрэбна вучыцца і набываць веды? Якую ролю ў жыцці чалавека адыгрывае чытанне кніг?



Правообладатель Национальный институт образования

***Ве́расень*** — назва асенняга месяца, якая паходзіць ад назвы расліны *верас*, што буйна цвіце ў беларускіх лясах у пачатку восені.

Разгледзьце малюнак на с. 3. Адкажыце на наступныя пытанні.

1. Хто адлюстраваны на малюнку?
2. Як апрануты дзеці, іх бацькі і настаўніца?
3. Што яны трымаюць у руках?
4. Як выглядаюць твары вучняў, іх бацькоў і настаўніцы? Чаму?
5. Раскажыце, як прайшоў ваш першы дзень у школе?
   - Як вы збіраліся ў школу?
   - Хто прывёў вас на ўрачыстую лінейку?
   - З кім сустрэліся ў школе?
   - Пра што цікавае даведаліся на першым уроку?

## Маўленчая размінка

У скорагаворках Васіля Жуковіча правільна вымаўляйце гукі [ц’], [дз’], [г], [р].



Правообладатель Национальный институт образования

## Верасень



Вырас верас і цвіце,
Восень, верасень ідзе.

## Кастрычнік

Кастры — гара.
Кастры гараць.
Парадак
у гаспадара.



## Лістапад

У садзе ў лістападзе
Апошні ліст апа́дзе.

# ПЕРШАГА ВЕРАСНЯ

*Міхась Пазнякоў*

Дзень святочны,
дзень вясёлы.
Пахнуць яблыкі
ў садах.



Правообладатель Национальный институт образования



Мы ідзём
сягоння ў школу,
ранцы новыя
ў руках.
Мы настаўніцу
вітаем.
Ад усмешак
светлы клас,
нават восень
залатая
вельмі просіцца
да нас.



1. Хто ў вершы расказвае пра свой першы вераснёўскі дзень? Падмацуйце сваю думку адпаведнымі радкамі з твора.
2. Які настрой выклікае ў вас гэты верш: *вясёлы, радасны* ці *трывожны, сумны*? Чаму?
3. Якімі першымі прыкметамі восені любуюцца дзеці? Прачытайце.
4. Чым спадабаўся вам гэты верш?
5. Разгледзьце ілюстрацыю да верша. Падбярыце і прачытайце радкі, якімі можна яе падпісаць.


Правообладатель Национальный институт образования

***Саро́мецца*** — адчуваць няёмкасць за свае ўчынкі, паводзіны.
***Хлус*** — той, хто гаворыць няпраўду, падманшчык.

## НАВУКА ЧЫТАННЯ

Хлопчык Алесь вельмі любіў казкі пра жывёлу, прыроду і розныя прыгоды. Але любіў, калі яму чыталі, бо сам ле-на-ваў-ся і не ўмеў. Маці шка-да-ва-ла хлопца, лічыла, што ў школе навучаць Алеся чы-таць са-ма-стой-на, і па-га-джа-ла-ся, чы-тала яму сама. Да школы Алесь ведаў шмат бе-ла-ру-скіх народных казак, а так-сама творы Пушкіна, братоў Грым, Ан-дэр-са-на. Але час ішоў, хлопчык пайшоў вучыцца ў першы клас, і там зда-ры-ла-ся такое...

Калі настаўніца спы-та-ла-ся ў пер-ша-кла-сні-каў, якія кнігі яны пра-чы-та-лі, Алесь га-на-рлі-ва пачаў пе-ра-лі-чваць усе «свае» да-ся-гне-нні. Гэта за-ці-ка-ві-ла


Правообладатель Национальный институт образования



настаўніцу, а таксама і а-дна-кла-сні-каў. На пе-ра-пын-ку дзеці са-бра-лі-ся вакол свайго сябра і пачалі распыт-ваць яго. Алесь пе-ра-ка-зваў адну, другую, трэцюю казку з за-ха-пле-ннем, а яго сябры ўважліва слухалі. Але знайшоўся за-дзі-ры-сты хлопчык Міхаська, які папрасіў Алеся прачытаць любімую казку «Лёгкі хлеб».

Захоплены хлуснёй, Алесь зусім забыў-ся пра сваё няўменне. Ён паважна ўзяў кнігу з рук Міхася, разгарнуў яе і па-бачыў, што літары для яго — зусім не зра-зу-ме-лы-я, і нават назву ён прачы-таць не можа. Алесь глядзеў на літары, быццам баран на новыя вароты, і думаў: «Каб я хоць назву прачытаў, то ўспомніў бы, пра што тут. Маці, напэўна, чытала



Правообладатель Национальный институт образования

мне гэтую казку». За-са-ро-меў-ся хлопчык, не вымавіў ані слова і аддаў кнігу Міхасю, які зразумеў і сказаў: «Вось які хвалько! Хіба можна столькі кніг самому прачытаць, калі ты не ўмееш?» Дзеці засмя-я-лі-ся. Хлопчыку стала горка ад таго, што яго назвалі хлу́сам, і ён зразумеў, як важна на-ву-чы-цца чытаць самому.

Пафантазіруйце, як закончыцца апавяданне.

Увечары ён звярнуўся па да-па-мо-гу да мамы — і на гэты раз усё а-тры-ма-ла-ся. Цяпер Алесь сам будзе выбіраць для сябе най-ці-ка-вей-шы-я кнігі і чытаць іх!

*Паводле Ганны Лукашэвіч.*

1. Пра каго гаворыцца ў апавяданні?
2. Якімі здольнасцямі валодаў Алесь? Прачытайце адпаведныя радкі.
3. Патлумачце сэнс выразу «быццам баран на новыя вароты».



Правообладатель Национальный институт образования

4. Чаму Міхаська прапанаваў Алесю пачытаць кнігу?
5. Які вывад зрабіў Алесь? Прачытайце адпаведныя словы.
6. Разгледзьце ілюстрацыю да апавядання. Знайдзіце пачатак і канец урыўка, які праілюстраваны. Прачытайце яго.
7. Уявіце, што вы таксама былі побач з героямі апавядання. Што параілі б Алесю і хлопцам, каб не трапляць у непрыемную сітуацыю?



Абмяркуйце, што прымусіла хлопчыка навучыцца чытаць.



У першую нядзелю верасня ў нашай рэспубліцы штогод адзначаецца **Дзень беларускай пісьме́ннасці.**

Гэта свята далучае людзей да роднай мовы і беларускай кнігі.

## Прыказка

Да чаго не дойдзеш, тое ў кніжцы знойдзеш.



Правообладатель Национальный институт образования

***Пта́шка*** — тое, што і птушка.
***Што-ко́львек*** — што-небудзь.

# КАТОК

*Адам Гурыновіч*



Сядзіць над вадою маленькі
каток,
Глядзіць ён на рыбкі,
разінуў раток.
Хацеў бы дастаць іх —
баіцца скакнуць,
Баіцца вадою ён ног
абмакнуць.

А хлопчык маленькі над кніжкай
сядзіць.
Яе ён раскрыўшы, на вершы
глядзіць.
І рад бы вучыцца, хацеў бы
ўсё знаць —
Ды шкода галоўкі сваёй бедаваць.



Правообладатель Национальный институт образования

Ах, дарма, мой хлопчык, напрасна,
дзіця, —
Пячоныя пташкі ў рот не ляцяць.
Калі ты што-кольвек захочаш пазнаць,
То мусіш не мала над тым працаваць.



1. Пра каго гаворыцца ў вершы? Знайдзіце і прачытайце радкі пра паводзіны катка і хлопчыка.
2. Якімі якасцямі надзелены каток? Чаму яго можна апраўдаць?
3. У якіх радках аўтар гаворыць пра недастатковую стараннасць хлопчыка? Прачытайце іх.
4. Паэт называе сваіх герояў ласкава. Як вы думаеце чаму?
5. Якія словы з’яўляюцца ў вершы павучальнымі? Знайдзіце і прачытайце іх. Як вы разумееце сэнс гэтых слоў? Патлумачце.



Абмяркуйце са сваім суседам па парце пытанне «Чаму пісьменнік назваў верш “Каток”, а звяртаецца да хлопчыка?».



Правообладатель Национальный институт образования

*Ажывíцца* — стаць больш актыўным, дзейным.

## ЯК МІКІТКА СУКЕНКУ З'ЕЎ

*Мікола Чарняўскі*

Прыехаў Мікітка да бабулі Алены ў госці. Па-ча-ста-ва-лі-ся, тады бабуля і пытае:

— А ты, Мікітка, не забыў бе-ла-ру-скі-я словы, добра ведаеш іх?

— Не, не забыў, — у-пэў-не-на адказаў унук, за-пі-хва-ю-чы ў рот цукерку. — Можаш праверыць, як я гавару.

— Тады так зробім, — а-жы-ві-ла-ся бабуля Алена. — Я спачатку буду вымаўляць словы па-руску, а ты — перdesigned казваць іх за мною па-беларуску. Пе-ра-кла-дчы-кам будзеш. Да-мо-ві-лі-ся?

— Дамовіліся, — згадзіўся ўнук і заадно па-ці-ка-віў-ся: — А што робіць перакладчык?



Правообладатель Национальный институт образования

— Зараз пабачыш сам, — яшчэ болей ажывілася бабуля і пачала падшукваць у памяці словы, якія можна было б задаць унуку. А Мікітка па-сур’-ё-знеў, нават цукерку за шчакою прытрымаў.

Бабуля ж пачала:

— Клюква.

— Жу-ра-ві-ны.

— Лук.

— Цыбуля.

— Картошка.

— Бульба.

— Сахар.

— Цукар.

— Бумага.

— Папера.

— Аист.

— Бусел...



Гэтак пе-ра-бра-лі дзясяткі са два слоў. У-ба-чыў-шы, што ўнуку ўсё даецца лёгка, бабуля Алена пра-па-на-ва-ла:

— А цяпер давай на-а-два-рот зробім. Будзем словы перакладаць з беларускай мовы на рускую.



Правообладатель Национальный институт образования

І ўжо на першым жа слове не-ча-ка-на спа-ты-кну-лі-ся.

— Сукенка, — вы-ма-ві-ла бабуля Алена, з усмешкай зірнуўшы ў вочы ўнуку.

— Конфета, — хуценька пераклаў Мікітка і языком перакінуў «конфету» за другую шчаку.

— Авой! — прытворна здзі-ві-ла-ся бабуля Алена. — Няўжо ты можаш з’есці... «платье»? Сукенка — па-руску «платье»!

— Не, бабуля, ты жартуеш, — па-крыў-дзіў-ся Мікітка. — Я добра ведаю, што цукерка — гэта «конфета».

— Дык я ж пра сукенку гаварыла, — аж крышку ра-згу-бі-ла-ся бабуля Алена.

— А я пра цукерку, — соладка прыцмокнуў Мікітка.

Абодва за-да-во-ле-на рассмяяліся. Асабліва ра-да-ваў-ся Мікітка: пабыў жа перакладчыкам. А што недачуў трошкі — з кім такога не бывае?

1. Пра каго гаворыцца ў апавяданні?
2. У якую гульню прапанавала пагуляць бабуля Алена свайму ўнуку Мікітку?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Як адчуваў сябе хлопчык падчас перакладу слоў? Чаму?
4. Якая смешная сітуацыя адбылася ў Мікіткі са словам *сукенка*? Чаму?
5. Які вывад можна зрабіць з сітуацыі, у якую трапіў Мікітка?
6. Ці спадабаліся вам бабуля Алена і яе ўнук Мікітка? Чаму?

1. Правядзіце гульню «Перакладчык». Задайце адно аднаму словы, якія загадвала бабуля ўнуку, назавіце іх па-беларуску і па-руску.
2. Падрыхтуйце выразнае чытанне апавядання «Як Мікітка сукенку з’еў» па ролях. Для гэтага адзначце ў тэксце словы герояў і аўтара. Пастарайцеся перадаць жаданне парадаваць бабулю сваімі адказамі.

15 верасня ў нашай рэспубліцы штогод адзначаецца свята — **Дзень бібліятэк.** Далучыцеся да гэтай падзеі: наведайце школьную ці дзіцячую бібліятэку, павіншуйце бібліятэкараў, парадуйце і сябе чытаннем новай кнігі.



Правообладатель Национальный институт образования

*Леге́нда* — народнае апавяданне пра якую-небудзь падзею ці чалавека, не пацверджанае гістарычнымі дакументамі.
*Пада́нне* — вуснае апавяданне пра мінулае, у якім тлумачацца рэальныя з'явы жыцця, расказваецца пра значныя падзеі роднага краю, пра народных герояў.
*Кніга́рня* — кніжны магазін.
*Чыта́льня* — спецыяльнае памяшканне ў бібліятэцы для чытання ці заняткаў.

## МАЕ СЯБРЫ

*Васіль Жуковіч*



Я такую звычку ма́ю:
час для кніжак берагу́ —
кожны-кожны дзень чытаю,
бо іначай не магу.

Вершы і апавяданні, казкі
вельмі я люблю,
і легенды, і паданні
пра бацькоўскую зямлю.



Правообладатель Национальный институт образования

То ў кнігарню завітаю,
то ў чытальню я іду.
Многа кніжак прачытаю —
многа я сяброў знайду.

1. Які настрой выклікаў у вас верш «Мае сябры»? Чаму?
2. Каго аўтар твора лічыць сваімі сябрамі? Знайдзіце адказ у вершы. Прачытайце.
3. Па чым можна здагадацца, што паэт сапраўды любіць чытаць? Падмацуйце свой адказ адпаведнымі радкамі з твора.
4. Якія кнігі любіць чытаць герой верша? Знайдзіце адказ у творы. Прачытайце.
5. Пра што хацеў сказаць нам аўтар?
6. Прачытайце прыказкі. Якая з іх падыходзіць да верша «Мае сябры» В. Жуковіча? Назавіце літару з правільным адказам.

   **А**. Чалавек без сябра, што ежа без солі.
   **Б**. Як ты да людзей, так і людзі да цябе.
   **В**. Кнігі — найлепшыя сябры.

7. Ці з'яўляюцца кнігі сябрамі для вас? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

## Правер свае дасягненні па тэме «Вераснёвы школьны ранак»

*Ведаю...*

1. Чаму першы месяц восені назвалі вераснем?

2. З якіх твораў узяты гэтыя словы?

а) То ў кнігарню завітаю,
то ў чытальню я іду.
Многа кніжак прачытаю —
многа я сяброў знайду;

б) Ах, дарма, мой хлопчык,
напрасна, дзіця, —
Пячоныя пташкі ў рот не ляцяць.
Калі ты што-кольвек захочаш
пазнаць,
То мусіш не мала над тым
працаваць;

в) «Дзеці засмяяліся. Хлопчыку стала горка ад таго, што яго назвалі хлусам, і ён зразумеў, як важна навучыцца чытаць самому.



Правообладатель Национальный институт образования

Увечары ён звярнуўся да мамы па дапамогу — і на гэты раз усё атрымалася. Цяпер Алесь сам будзе выбіраць для сябе найцікавейшыя кнігі і чытаць іх!».

3. Адкажыце на пытанні.

а) Хто дужа хацеў трапіць у клас да вучняў з верша Міхася Пазнякова «Першага верасня»?

б) Хто вучыў беларускім словам Мікітку з апавядання Міколы Чарняўскага «Як Мікітка сукенку з’еў»?

в) Які настрой выклікаюць вершы «Першага верасня» Міхася Пазнякова, «Мае сябры» Васіля Жуковіча і «Каток» Адама Гурыновіча?

г) У якім апавяданні хлопчык Алесь яшчэ да школы ведаў шмат беларускіх народных казак, а таксама казкі Пушкіна, братоў Грым і Андэрсана?

***Разумею, магу растлумачыць...***

1. Чаму, на вашу думку, людзі лічаць кнігі лепшымі сябрамі?



Правообладатель Национальный институт образования

2. Калі першакласнік Алесь з апавядання Ганны Лукашэвіч «Навука чытання» зразумеў, як важна ўмець чытаць?

3. Што б вы параілі хлопчыку з верша Адама Гурыновіча «Каток»? Пераканайце яго, што ў жыцці важна ўмець уважліва чытаць кнігі.

4. Навошта бабуля Алена з твора Міколы Чарняўскага «Як Мікітка сукенку з'еў» старалася гаварыць з унукам па-беларуску?

*Умею...*

1. Вызначаць герояў твораў Міхася Пазнякова «Першага верасня», Адама Гурыновіча «Каток», Міколы Чарняўскага «Як Мікітка сукенку з'еў», Ганны Лукашэвіч «Навука чытання».

2. Выразна чытаць па ролях апавяданне Міколы Чарняўскага «Як Мікітка сукенку з'еў».

Правообладатель Национальный институт образования

# ВОСЕНЬСКІЯ ГІСТОРЫІ



**Мы пазнаёмімся** з творамі пра восеньскую прыроду, яе прыгажосць, пра змены, якія адбываюцца ў гэтую пару года.

**Мы будзем вучыцца:**

- знаходзіць у вершах і апавяданнях апісанне восеньскай прыроды;
- знаходзіць словы і выразы, якія характарызуюць герояў твораў;
- чытаць выразна, захоўваючы інтанацыю сказа і вытрымліваючы паўзы.

**Варта задумацца:**

Чаму пісьменнікі ў сваіх творах звяртаюцца да тэмы восені?



Правообладатель Национальный институт образования

## Маўленчая размінка

Прачытайце верш. Правільна вымаўляйце гукі [р], [дз’], [ц’], [ч].

### Восень

Восень пада**р**ыла
Людзям па**р**асоны,
Лес пазала**ц**іла
Фа**р**баю **ч**ы**р**вонай.

*Леанід Дайнека.*

Разгледзьце тры малюнкі асенняга лесу. На якім з іх адлюстравана ранняя восень, залатая, позняя?









Правообладатель Национальный институт образования

***Сту́жка*** — палоска каляровай тканіны, якая выкарыстоўваецца для ўпрыгожвання.
***Вы́рай*** — цёплы край, куды адлятаюць пералётныя птушкі на зіму.
***Про́сінь*** — сіні адліў, сіні прасвет у афарбоўцы чаго-небудзь.

## МАЛАДАЯ ВОСЕНЬ

*Васіль Жуковіч*



Залатыя стужкі
на бярозцы мілай.
Адлятаюць птушкі
ў далёкі вырай.

І вятры крутыя
гучна загамоняць,
воблакі густыя
неба запалоняць.

А пакуль што — просінь
між аблокаў белых.
Маладая восень
толькі прыляцела.



Правообладатель Национальный институт образования

У вершы паэт называе стужкі «залатымі», бярозку «мілай». Гэтыя словы ў літаратуры прынята лічыць **вобразнымі**. Яны дапамагаюць ярка, жыва ўявіць прадмет і адчуць адносіны аўтара да яго.

1. Пра якую пару года гаворыць аўтар? Пацвердзіце сваю думку адпаведнымі радкамі з верша.
2. Які настрой узнік у вас пасля прачытання верша «Маладая восень»? Чаму?



*Дзмітрый Шчаглоў*. Цёплы верасень



Правообладатель Национальный институт образования

3. Вусна апішыце малюнкі ранняй восені, якія вы ўяўлялі падчас чытання твора.
4. Знайдзіце і прачытайце прыкметы позняй восені. Які настрой яны выклікаюць у вас? Чаму?
5. Адшукайце ў творы вобразныя словы і выразы.
6. У якім тэмпе — спакойным ці хуткім — трэба чытаць твор Васіля Жуковіча? Чаму?
7. Вывучыце верш на памяць.



Уважліва разгледзьце карціну мастака Дзмітрыя Шчаглова «Цёплы верасень». Якія радкі твора Васіля Жуковіча поўнасцю адпавядаюць карціне? Прачытайце іх.



Ці падабаецца паэту Васілю Жуковічу восень? Чаму вы так думаеце?

## Загадка



Крыл не маюць, а лятуць,
Ног не маюць, а бягуць.
Не ў вадзе, але з вадою.
Адгадай жа, што такое.

*Міхась Пазнякоў.*



Правообладатель Национальный институт образования

***Каме́ль*** — ніжняя, патоўшчаная частка дрэва.
***Ша́ты*** — покрыва з лісця, са снегу.
***Кра́скі*** — кветкі.
***Крамя́ны*** — цвёрды, сакавіты.
***Захіну́ць*** — засланіць, прыкрыць чым-небудзь.
***Засе́к*** — адгароджанае месца для захавання збожжа.
***Па́церкі*** — упрыгожанне ў выглядзе нанізаных на нітку дробных шарыкаў ці прадметаў іншай формы, якое надзяваецца на шыю.

## ВЕРАСЕНЬ

*Клаўдзія Каліна*

Месяц Верасень багаты — у яго за-ла-ты-я шаты. Ходзіць ён па зямлі і дорыць ёй свае багацці. Зайшоў Верасень у сады ця-ні-сты-я, атрос ігрушы за-ла-ці-сты-я. Асыпаў з яблынь ду-хмя-ны-я ан-то-наў-кі, чы-рво-ны-я кра-мя́-ны-я ма-лі-наў-кі, захінуў ту-ма-на-мі слівы сінія... Выйшаў



Правообладатель Национальный институт образования

у поле, наставіў мяхоў бульбы, на лузе склаў у копы траву і падаўся ў лес. Ідзе Верасень лесам, пры-бі-ра-е дрэвы ў да-ра-гі-я ўборы: бя-рэ-зін-ку — у золата, асі-ну — у чырвань, на дубы навесіў медны ўбор. Не забыўся і пра каліну ды рабіну, пры-ха-ра-шыў іх па-цер-ка-мі чырвоны-мі. Пад пянёчкі ды пад кусточкі пасадзіў грыбочкі... А-зі-рнуў-ся Верасень, пагля-дзеў навокал: гарыць-палае асенні лес! Вось толькі ўнізе трава сухая і па-жоў-кла-я. Няма красак, адцвілі за лета. Стра-сянуў Верасень з дрэў буйну́ю расу — і дзіва! Упалі да камлёў зялёных сосен ды залатых бяроз дра-бню-ткі-я званочкі! Зацвілі верасы! Загулі, за-зва-ні-лі званоч-кі! Клічуць дзяцей у школу.

Багаты месяц Верасень, багаты! Ён па-дараваў зямлі пышныя шаты. Насыпаў поўныя засекі збожжа. Адзеў у золата ля-сы і расквеціў верасы. Таму і завуць яго Верасень.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Якія пачуцці ўзніклі ў вас пры чытанні гэтага твора?
2. Ці спадабаўся вам Верасень? Чаму?
3. Ці можна параўнаць Верасня з чалавекам? Чаму? А з Дзедам Марозам?
4. Знайдзіце ў творы і прачытайце вобразныя словы-дзеянні, якімі надзелены Верасень (***ходзіць*** *па зямлі,* ***дорыць*** *ёй багацці,* ***атрос*** *ігрушы, на лузе* ***склаў*** *у копы траву і* ***падаўся*** *ў лес,* ***прыбірае*** *дрэвы,* ***пасадзіў*** *грыбочкі).*
5. Па чым бачна, што пісьменніцы падабаецца Верасень?

Уважліва разгледзьце на форзацы рэпрадукцыі карцін «Восеньскі сад» Алены Бархатковай, «Восеньскія бярозкі» Віктара Каралёва. Падбярыце тыя радкі з казкі Клаўдзіі Каліны «Верасень», якія могуць стаць назвамі да твораў мастакоў.

## Прыказкі

Садок пасадзіў — добрую справу зрабіў.
Трэба нахіліцца, каб вады напіцца.
Будзеш працаваць — будуць людзі паважаць.



Правообладатель Национальный институт образования

***Валакно́*** — тут: тонкая няпрадзеная нітка.
***Падне́б'е*** — нябесная высь.
***Шо́лам*** — шум, крык.
***Дол*** — зямля.
***Мкну́цца*** — хутка рухацца, накіроўвацца куды-небудзь.



## АДЛЁТ ЖУРАЎЛЁЎ

*Якуб Колас*

Белыя валокны
Сцелюцца над долам.
Не спяваюць птушкі,
Сціхнуў лесу шолам.

Сцелюцца валокны,
Тчэцца павуціна —
Блізка, блізка восень,
Смутная часіна!

Замірае лета,
Заціхаюць далі,
Сірацее рэчка,
Халадзеюць хвалі.



Правообладатель Национальный институт образования

У бязмежным небе
Роўненькім шнурочкам
Жураўлі на вырай
Мкнуцца над лясочкам.

Меншыцца шнурочак,
У паднéб’і тáе,
Вось ледзь-ледзь чарнее,
Міг — і прападае.

1. Які настрой выклікаў у вас верш Якуба Коласа? Чаму?
2. Якія малюнкі ранняй восені вы ўяўлялі, калі чыталі твор? Вусна апішыце іх.
3. Чаму Якуб Колас называе восень «смутнай», ужывае выразы: «замірае лета», «сірацее рэчка»?
4. З чым параўноўвае паэт жураўлёў, якія ляцяць у небе?
5. Якімі словамі Якуб Колас перадаў свае пачуцці да восені? Прачытайце іх.
6. Знайдзіце ў вершы радкі, якія трэба чытаць павольна. Прачытайце іх.
7. Знайдзіце радкі, да якіх хацелася б намаляваць ілюстрацыю. Раскажыце пра свой малюнак.


Правообладатель Национальный институт образования

**8.** Падрыхтуйце выразнае чытанне верша. Пастарайцеся перадаць голасам сум і шкадаванне па прычыне адлёту птушак.

Ці даводзілася вам назіраць, як ляцяць у вырай жураўлі? Які настрой выклікаў у вас адлёт птушак?



*Тацццяна Пятрова.* Адлёт птушак

Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны. Адкажыце на пытанні.

1. Каго і што вы бачыце на карціне?
2. Дзе сабраліся птушкі ў чараду? Чым яны заняты?



Правообладатель Национальный институт образования

3. Якія птушкі адлюстраваны мастаком на пярэднім плане?
4. Хто знаходзіцца ля самай вады?
5. Якіх птушак вы бачыце на вадзе?
6. Чароды якіх птушак узняліся высока ў асенняе неба?
7. Як выглядае прырода: трава, лес удалечыні, вада на возеры і неба?
8. Які настрой выклікае ў вас гэта карціна? Чаму?

Падрыхтуйце вуснае паведамленне на тэму «Адлёт птушак» на аснове пытанняў.

## Загадка

Ходзіць па балоце
У густым чароце,
Там, дзе твань і мель,
Птушка ... .

*Уладзімір Карызна.*



## Прыкметы

Жураўлі ляцяць высока — зіма яшчэ далёка.

Жураўлі ляцяць нізка — зіма ўжо блізка.



Правообладатель Национальный институт образования

***Пятро́ і Ілья́*** — рэлігійныя святы, якія адзначаюцца адпаведна 12 ліпеня і 2 жніўня.

***Ве́жа*** — высокае і вузкае збудаванне.

***Картафля́нік*** — сухое сцябло бульбы.

***Ржы́шча*** — рэшткі (ніжняя частка) сцёблаў збожжавых культур пасля ўборкі ўраджаю.

***Гутарлі́вы*** — гаваркі́, гаманкі́.

***Сі́та*** — рэшата з густой сеткай для прасейвання сыпкіх рэчываў.

## ВОСЕНЬ

«Прыйшоў Пятрок — апаў лісток; прыйшоў Ілья — апала два». Так кажуць людзі, бачачы чуць ві́дны паварот ад лета к восені.

Луг ужо скошаны. Дзе яшчэ тыдзень таму назад ка-лы-ха-лі-ся высокія зялёныя тра́вы, блішчалі кветкі — там цяпер пуста. Адны толькі стагі, як вежы, па-рас-кі-да-лі-ся па грудочках то тут, то там. Ма-ла-дзень-ка-я травіца, якая вырасла



Правообладатель Национальный институт образования



замест старой, блішчыць на сонцы і сцелецца па зямлі, калі павее вецер. Ёй ужо не вырасці да старой. Буслы даўно пазлятала з гнёздаў і ходзяць чародамі па лузе або кружацца высока-высока ў небе.

Жыта на полі зжата і звезена; авёс і ячмень сабраны. Толькі дзе-нідзе жаўцее чыя-небудзь палоска позняга аўса ці ячменю. Кар-та-фля-нік на бульбе павяў, апусціў сухое лісце. Глуха і нудна на полі. Ужо не чутно спакойнай гаворкі ціхага ветру з ка-ла-ска-мі збожжа. Толькі ржышча гаворыць, што тут яшчэ нядаўна кра-са-ва-лі-ся пасевы. Ужо не тра-пе-чу-цца



Правообладатель Национальный институт образования

ў небе над полем жа-ва-ран-кі з мілымі песнямі. Прайшла вясёлая пара лета, усё адцвіло, ад-кра-са-ва-ла. Усюды, куды ні глянь, на-кла-да-е восень свой след, сваю руку.

А глянеш на лес! Ці той гэта лес? Як змяніўся ты, чорны, высокі, чуць-чуць засла́ны сінім туманам, далёкі лес! Яшчэ так нядаўна ахвотна хаваў ты чалавека і жывёлу ад пякучага сонца пад густою страхою зялёных сваіх лістоў. Тысячы галасоў усякіх птушак, вясёлы іх шчэбет ра-ссы-па-лі-ся ў тваім гушчары. Эх, гу-та-рлі́-вы лес! Люблю я цябе, люблю твой шум, халадок тваіх лістоў і твой здаровы смаляны́ пах. А цяпер ціха і глуха і ў лесе. Птушкі перасталі спяваць, лісце па-жоўкла і патроху а-сы-па-е-цца на дол.

Сонца не грэе так ярка, як улетку. Кожны дзень яно ўсё ніжэй і ніжэй ходзіць на небе. Неба часцей і часцей за-сці-ла-е-цца хмарамі. Нявесела пазірае яно, за-сла-на-е смутнымі хмаркамі, як за-а-ра-на-е



Правообладатель Национальный институт образования

поле. Дробны дожджык сеецца, як скрозь сіта. Нудна і не-пры-туль-на выглядае ўсё ўвосень.

*Паводле Якуба Коласа.*

1. Які настрой выклікала ў вас апавяданне Якуба Коласа? Чаму?
2. З дапамогай якіх слоў і выразаў пісьменніку ўдалося стварыць сумны настрой у творы? Знайдзіце і прачытайце іх.
3. Чаму Якуб Колас размаўляе з лесам, як з чалавекам? Аб чым гэта сведчыць?
4. Патлумачце сэнс выразу «накладае восень свой след, сваю руку».
5. Ці падабаецца аўтару восень? Чаму вы так думаеце?
6. Разгледзьце ілюстрацыю да апавядання. Якія малюнкі можна яшчэ зрабіць да твора?

Уважліва разгледзьце рэпрадукцыю карціны «Залатая восень» на с. 38. Адкажыце на пытанні.

1. Ці спадабалася вам гэта карціна? Чаму?
2. Чаму восень называецца залатой?



Правообладатель Национальный институт образования



*Ісаак Левітан.* Залатая восень

3. Ці ўсе дрэвы восенню апранаюцца ў залатое лісце? Якія дрэвы застаюцца зялёнымі?
4. Што вы можаце сказаць пра бярозкі? Якія яны?
5. Як выглядае неба? Якой стала трава?
6. Як адлюстравана на карціне рэчка?
7. Што намалявана на заднім плане, на паваро-це рэчкі?
8. Якія колеры пераважаюць на карціне?
9. Якія ўражанні склаліся ў вас ад прагляду гэтай карціны?



Правообладатель Национальный институт образования

***Кашо́лка (разм.)*** — плецены з лазы кош.
***Гай*** — невялікі лісцевы лес.
***Вы́варацень*** — вывернутае з коранем дрэва.
***Бузі́ннік*** — густы куст бузіны́, расліны з чырвонымі або чорнымі ягадамі.
***Хмызня́к*** — густыя кусты, зараснік.

## ГРЫБНІК

*Рыгор Ігнаценка*

Грыбы сёлета з’явіліся са спазненнем. Але затое — колькі! Людзі носяць кашамі, ка-шол-ка-мі, вёдрамі, а іх усё не меншае.

Надышла восень. Ранкамі се-ра-бры-сты іней дзе-нідзе на стрэхах забялеў, а грыбы ўсё растуць. Ды якія грыбы! Найбольш баравікі і па-да-сі-на-ві-кі.

Назбіраў я гэты раз кашолку маладзенькіх падасінавікаў ды іду сабе дахаты. Бачу — бярозавы гаёк. Дай, думаю, зазірну, як там з грыбамі. Зайшоў і вачам



Правообладатель Национальный институт образования



не паверыў: баравікоў — хоць касу закладвай.

Што рабіць? Мая кашолка поўная падасінавікаў, але ж і баравікоў шкада пакідаць.

Пастаяў трохі, падумаў, потым высыпаў падасінавікі пад елачку, каб пасля забраць, ды пачаў баравікі збіраць. Пахадзіў па бярэзніку — зноў поўная кашолка.

Прыходжу назаўтра на знаёмае месца. Зірк — нехта мае грыбы на вы́-ва-ра-тні расклаў. Да таго ж — усе ўгору ша-пачка-мі. Гэта на выпадак дажджу, каб не намоклі.

«Вось табе і на! — падзівіўся я і прысеў побач на пень. — Хто ж гэта па-га-спа-да-



Правообладатель Национальный институт образования

рыў тут? Каму мае падасінавічкі спа-трэ-бі-лі-ся?»

Паспрабуйце здагадацца і адказаць на гэтыя пытанні.

Я ведаў, што вавёркі любяць грыбы. Нават сушаць на зіму. Але ж яны іх чапляюць на сучках і галінках дрэў. А гэтыя ляжаць на вываратні.

Нечакана ззаду нехта затупаў. Па-ва-ро-чва-ю-ся, ажно з за-ла-ці-ста-га бузі́н-ніку нетаропка барсук выходзіць. Мяне ён не бачыць і шыбуе проста да елачкі, дзе засталося яшчэ некалькі маіх пада-сінавічкаў. Бярэ а-сця-ро-жна адзін гры-бок у зубы і — да вываратня. Паклаў угору шапачкай на шур-па-ту-ю кару́ дрэва і за другім патру́хаў. Носіць звярок мае грыбы ды за-да-во-ле-на носам сапе́.

Нарэшце, на пятым ці, можа, на шос-тым заходзе барсук пад-сле-па-ва-ты-мі воч-камі зірнуў на мяне, спалохана фыркнуў,



Правообладатель Национальный институт образования

выпусціў з зубоў грыб, кру-та-нуў-ся — і ў хмызняк. Толькі сухое лісце за-ша-ма-це-ла.

Па-смя-яў-ся я з грыбніка і ціха падаўся ў другі бок. Навошта мне гэтыя грыбы? Ці ж мала іх у лесе? Пахаджу якую гадзі-ну-другую і назбіраю маладзенькіх ба-ра-ві-чкоў. А падасінавікі няхай барсуку застаюцца. Халоднай зімою спа-трэ-бя-цца.

1. У якую пару года адбываюцца падзеі, апісаныя ў апавяданні? Пацвердзіце сваю думку адпаведнымі радкамі з твора.
2. Што вы даведаліся пра грыбніка?
3. Што прымусіла яго пакінуць на ноч свае пада-сінавічкі пад елкаю?
4. Як вы разумееце выраз «баравікоў — хоць касу закладвай»? Патлумачце.
5. Чаму чалавек пакінуў свае грыбы барсуку? Аб чым гэта сведчыць?
6. Раскрыйце сэнс назвы апавядання Рыгора Ігнаценкі.
7. Знайдзіце ў тэксце пачатак і канец урыўка, які праілюстраваны. Прачытайце яго.



Правообладатель Национальный институт образования



Падрыхтуйце па плане вуснае паведамленне на тэму «Як мы ў грыбы хадзілі».

П л а н

1. З кім вы сабраліся пайсці ў грыбы?
2. А якой гадзіне адправіліся ў дарогу? Што з сабою ўзялі? Якое было надвор'е?
3. Дзе знаходзіцца лес? Як дабіраліся да яго?
4. Якія грыбы вам трапляліся? У якіх месцах яны раслі?
5. Як доўга вы збіралі грыбы? Хто з вас назбіраў больш?
6. Ці былі вы задаволены сваім паходам у лес? Чаму?



## ПЕСЕНЬКА

*Галіна Каржанеўская*

Назбіраю лісцяў я
У двары,
Што зляцелі з клёніка
Без пары.
Пакладу ў кнігу іх
Між лістоў.



Правообладатель Национальный институт образования

Хай ляжаць, аціхлыя,
Каля слоў.
Хай гавораць-шэпчуцца
Аб вясне.
Хай складаюць песеньку
Для мяне.





1. Які настрой выклікала ў вас «Песенька»?
2. Пра якую пару года расказваецца ў творы? Як вы здагадаліся?
3. Для чаго дзяўчынка вырашыла пакласці ў кнігу некалькі кляновых лістоў?
4. Знайдзіце ў вершы вобразныя словы і выразы. Прачытайце іх.
5. Ці спадабаўся вам твор? Чым?
6. Калі б вам прапанавалі сабраць лісты для гербарыя, то якім вы аддалі б перавагу? Патлумачце свой выбар.

## Загадка



Нітак шмат,
Ды іх, дружок,
Не зматаеш
Ты ў клубок.

*Уладзімір Карызна.*



Правообладатель Национальный институт образования

## Правер свае дасягненні па тэме «Восеньскія гісторыі»

*Ведаю...*

1. У якіх творах даецца такое апісанне восеньскай прыроды?

а) Замірае лета,
Заціхаюць далі,
Сірацее рэчка,
Халадзеюць хвалі;

б) «Надышла восень. Ранкамі серабрысты іней дзе-нідзе на стрэхах забялеў, а грыбы ўсё растуць. Ды якія грыбы! Найбольш баравікі і падасінавікі».

2. Адгадайце, пра каго ці пра што гаворыцца ў наступных радках.

а) «Люблю я цябе, люблю твой шум, халадок тваіх лістоў і твой здаровы смаляны пах. А цяпер ціха і глуха... Птушкі перасталі спяваць, лісце пажоўкла і патроху асыпаецца на дол»;

б) «Ён падараваў зямлі пышныя шаты. Насыпаў поўныя засекі збожжа.



Правообладатель Национальный институт образования

Адзеў у золата лясы і расквеціў ве-
расы».

3. Хто з’яўляецца аўтарам верша «Адлёт жураўлёў»?

4. Які настрой выклікаюць вершы «Маладая восень» Васіля Жуковіча і «Адлёт жураўлёў» Якуба Коласа?

5. Якія творы з раздзела «Восеньскія гісторыі» вам спадабаліся найбольш?

*Разумею, магу растлумачыць...*

1. Чаму твор Клаўдзіі Каліны «Верасень» можна назваць казкай?

2. Навошта дзяўчынка з верша Галіны Каржанеўскай «Песенька» вырашыла захаваць некалькі кляновых лісточкаў?

3. Чаму герой з апавядання Рыгора Ігнаценкі «Грыбнік» падараваў свае падасінавічкі барсуку?

*Умею...*

1. Чытаць на памяць верш Васіля Жуковіча «Маладая восень».

2. Выразна чытаць верш Якуба Коласа «Адлёт жураўлёў».



Правообладатель Национальный институт образования

# У СВЕЦЕ ВЕТЛІВАСЦІ І ДАБРЫНІ



**Мы пазнаёмімся** з цікавымі і павучальнымі творамі пра адносіны паміж людзьмі, пра ветлівасць і добразычлівасць у жыцці.

**Мы будзем вучыцца:**

- вызначаць рысы характару дзейных асоб;
- даваць уласную ацэнку іх учынкам;
- акрэсліваць тэму і галоўную думку твора.

**Варта задумацца:**

Чаму трэба быць добразычлівым, з павагай ставіцца да іншых і дапамагаць адно аднаму?



Правообладатель Национальный институт образования

# ПАДЗЯКА

*Павел Кавалёў*

Да прыпынку падышоў аўтобус. Дзіма разам з маці зайшоў праз пярэднія дзверы. На першых крэслах сядзелі маладыя людзі. Яны адразу ж усталі, каб даць месца Дзіму і яго маці.

Аўтобус крануўся. Праз два ці тры прыпынкі ў аўтобус зайшла бабуля. Дзіма хуценька ўсхапіўся з крэсла, каб села бабуля.

— Дзякуй табе, унучак, — сказала тая і села.





Правообладатель Национальный институт образования

Калі даехалі да свайго прыпынку і выйшлі з аўтобуса, Дзіма спытаў:

— Мама, а за што кажуць дзякуй?

— За ўсе добрыя справы, за павагу да людзей, — адказала маці. — І табе бабуля па-дзя-ка-ва-ла за тое, што ты ёй, старэнькай, месца ўступіў.

Дзіма заў-смі-хаў-ся. Яму ўпершыню сказалі дзякуй.

1. Як павёў сябе хлопчык, калі ў аўтобус зайшла бабуля?
2. У каго навучыўся Дзіма ўступаць месца старэйшым людзям у транспарце?
3. Што адказала мама на пытанне сына?
4. Які важны ўрок атрымаў Дзіма падчас паездкі? Чаму ён усміхаўся?
5. Што хацеў сказаць Павел Кавалёў сваім апавяданнем?
6. Якая з прыказак падыходзіць па сэнсе да гэтага твора?
   - *Шануй людзей, то і цябе пашануюць.*
   - *У людзей пытай, ды свой розум май.*
7. Звярніце ўвагу на ілюстрацыю да апавядання. Які эпізод на ёй адлюстраваны?



Правообладатель Национальный институт образования

***Апаўдня́*** — у сярэдзіне дня.

## ЧАТЫРЫ ПАЖАДАННІ

*Васіль Вітка*




Добра, калі ты змалку
Можаш вітаць людзей.
Раніцай: «Добрага ранку!»
І апаўдня́: «Добры дзень!»
Увечары пры сустрэчы
Знаёмым сказаць:
«Добры вечар!»
А соннаму сонейку нанач
І ўсім добрым лю́дзям:
«Дабра́нач!»

1. Пра якія ветлівыя словы гаворыцца ў творы? Калі яны ўжываюцца?
2. На якую тэму напісаны гэты твор?
3. З якім пачуццём трэба гаварыць і чытаць прывітальныя словы? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

4. Прачытайце твор спакойна, выдзяляючы голасам словы-вітанні.
5. Навошта людзі выкарыстоўваюць ветлівыя словы і выразы?
6. Разгледзьце малюнак да верша. Раскажыце, калі людзі ўжываюць гэтыя звароты ветлівасці. Якія з іх ужываеце вы?



Якія ветлівыя словы і выразы вы ведаеце? Разыграйце сітуацыі, дзе іх можна выкарыстаць.

## Прыказкі

Ласкавае слова, што веснавы дзень.

Як гукнеш, так і адгукнецца.

У добрага чалавека заўсёды многа добрых сяброў.

## Загадка




Крылаў не мае,
Ды хутка лятае.
Выпусціш —
Рад ці не рад,
Ды не зловіш назад.

*Міхась Пазнякоў.*



Правообладатель Национальный институт образования

***Глады́ш*** — высокая, звужаная ўверсе гліняная пасудзіна без ручкі.

## КАМУ СКАЗАЦЬ ДЗЯКУЙ?

*Ядвіга Бяганская*

Прынесла бабуля гладыш малака і пачала частаваць сваіх унукаў:

— Піце, дзеткі, малако. Яно смачнае, карыснае, будзеце здаровыя і дужыя.

— Дзякуем табе, бабуля, — выпіўшы малако, сказалі ўнукі.

— А вы не мне дзякуйце, а маёй кароўцы. Гэта ж яна дае малако.

Пабеглі дзеці на двор і пачалі дзякаваць карове, якая стаяла каля студні:

— Дзякуем табе, кароўка, за смачнае малако.

— Добра, што маё малако вам спа-да-ба-ла-ся. Але дзякаваць за яго трэба не мне, а траве, якую я скубу, — адказала карова.



Правообладатель Национальный институт образования



Пабеглі дзеці на зялёны луг, па-кла-ні-лі-ся нізка траве:

— Дзякуем табе, трава, што корміш нашу кароўку, якае дае смачнае малако.

— Карова цэлы дзень пасвіцца на лузе. Вось і падзякуйце зямлі, на якой я расту.

Пакланіліся дзеці зямлі і сказалі:

— Дзякуем табе, зямля, за траву, якую скубе наша кароўка і дае смачнае малако.

— Падзякуйце вадзе, якая поіць траву, — адказала зямля.

Пабеглі дзеці да ракі, пакланіліся вадзе:

— Дзякуем табе, вада, што поіш траву, якую скубе ба-буль-чы-на кароўка, каб па-ча-ста-ваць нас малаком.



Правообладатель Национальный институт образования

— Гэта праўда, я да-па-ма-га-ю зямлі вырошчваць траву. Але па-дзя-куй-це і сонцу за цяпло. І помніце, што толькі наша агульная праца дае вашай кароўцы смачнае малако.

1. Ці можна гэты твор назваць казкай? Чаму?
2. За што дзеці дзякавалі бабулі?
3. Каму яшчэ яны выказвалі падзяку? За што?
4. Чаму кожны з персанажаў адпраўляў дзяцей падзякаваць іншым насельнікам зямлі? Аб чым гэта сведчыць?
5. Якая асноўная думка гэтай казкі? У якім сказе яна найбольш выражана? Прачытайце.
6. Вызначце галоўную тэму твора *(ветлівасць, дабрыня, дружба, узаемавыручка, добрыя, дрэнныя справы).*
7. Размяркуйце казку па ролях. Для гэтага адзначце алоўкам у тэксце словы бабулі (б), дзяцей (д), кароўкі (к), травы (т), зямлі (з), вады (в). Праінсцэніруйце казку.

1. Падзяліце казку Ядвігі Бяганскай «Каму сказаць дзякуй?» на часткі згодна з прапанаваным планам.



Правообладатель Национальный институт образования

П л а н

1. Бабуля частавала сваіх унукаў малаком.
2. Падзяка карове.
3. Адправіліся дзеці на зялёны луг.
4. Пакланіліся зямлі.
5. Падзяка вадзе.
6. Адказ вады дзецям.



**2.** Падрабязна перакажыце змест казкі адно аднаму.

## Загадкі



1. Вадкае, а не вада, белае, а не снег.



2. Пасярод двара стаіць гара: спераду вілы, ззаду мятла.



3. Што нас корміць, а есці не просіць?



4. Без ног бяжыць, без вачэй глядзіць.



5. Кругленька, бяленька, усяму свету міленька.



Правообладатель Национальный институт образования

## Маўленчая размінка

Прачытайце верш. Выразна вымаўляйце гукі [ў], [дз’], [ц’], [ч], [г].

### На кірмашы



Па **сц**я**ж**ын**ц**ы сліма**ч**ок
**Цягне**-вала**ч**э дамок.
А **ў** дамку **сядзіць** камар,
Ён ахо**ў**вае тавар:
Кропельку расіны
Ды нітку паву**ці**ны.
Некаму на кірмашы
Яны буду**ць** да душы!

*Ніна Мацяш.*



***Вандро́ўнік*** — чалавек, які падарожнічае.
***Няго́да*** — дрэннае надвор’е, непагода.
***Слімáк*** — малюск, які мае ракавіну і вельмі марудна рухаецца.
***За́сень*** — месца, закрытае ад прамянёў сонца.
***Краплі́сты*** *(дождж)* — з вялікімі кроплямі.



Правообладатель Национальный институт образования

# ЖУК І СЛІМАК

*Максім Танк*

Пагожым летнім ранкам
На лузе за сялом
Сустрэўся жук аднойчы
З рагатым слімаком.

— Здарова! — жук вітае. —
Куды, браток, ідзеш
І з ракавіны хатку
Куды з сабой нясеш?

Абцёр слімак пот з твару,
Гаворыць так жуку:
— Нямала перажыць мне
Прыйшлося на вяку.

То сцюжа, то марозы,
То навальніца, дождж,
То часам у дарозе
Захопіць змрок і ноч.

Шукай тады начлегу
Пад нейкім пад кустом...
Вядуць размову гэтак
І раптам чуюць — гром.





Правообладатель Национальный институт образования

Ударыў дождж краплісты.
І жук пабег шукаць
У засені цяністай
Шырокага лістка.

Але на цэлым лузе
Няма страхі нідзе,
І мокры, ледзь жывы ён
Да слімака ідзе.

— Пусці, браток, пагрэцца,
Змок дужа на лугу,
Насіць за гэта хатку
Табе дапамагу.

У ракавіне шчыльнай
Вандроўнікі сядзяць.
Іх нават дождж краплісты
Не зможа ў ёй дастаць.

Але мінулі хмары,
І сонца ўстала зноў,
Жук хату слімакову
Пакінуў і пайшоў.


Правообладатель Национальный институт образования

Забыўся пра нягоды
І не наўме жуку,
Што абяцаў паднесці
Ён хату слімаку.

1. Пра каго расказвае Максім Танк у сваім творы?
2. Разгледзьце ілюстрацыі да верша. Вызначце, дзе паказаны жук, а дзе — слімак. Якія малюнкі хацелася б вам яшчэ намаляваць? Апішыце іх словамі.
3. Хто з персанажаў вам спадабаўся?
4. Чаму жук не стрымаў свайго абяцання дапамагаць слімаку насіць хатку? Як вы ацэньваеце ўчынак жука? Што вы параілі б яму?
5. З якім настроем патрэбна чытаць словы жука, калі ён просіцца ў хатку слімака? Чаму?
6. На якую тэму напісаны верш?
7. Чаму вучыць вас гэты твор?
8. Чаму верш «Жук і слімак» нагадвае казку?

1. Паразважайце, якім тонам і ў якім тэмпе варта чытаць твор Максіма Танка «Жук і слімак»? Чаму?
2. Размяркуйце ролі і прачытайце тэкст па ролях.



Правообладатель Национальный институт образования

***Ве́траеш*** — тут: гайдаешся на вятры.
***Або́е рабо́е*** — пра людзей, падобных у чым-небудзь адзін на аднаго (па нейкіх адмоўных якасцях).
***Патыка́цца*** — штурхаць, спрабаваць пралезці, перашкаджаць.
***Увіха́цца*** — хутка і спрытна рабіць штонебудзь.
***Пры́зба*** — невысокі земляны насып уздоўж сцен хаты.

## ГУТАРКА АСОТУ З КРАПІВОЮ

— Што ты патыка́ўся са мною? — крычала крапіва́ асоту. — Ці я табе раўня? Нічога ты не робіш; ніхто цябе не знае; ве́траеш недзе ў полі сярод аўсоў. Вось я так увіха́юся: таго крапіва пацалуе, хто крапіву згатуе. Кожны крапіву знае, кожны ўспамінае, на кожным падворку расту я. Глядзь! Ужо аж да прызбаў падпаўзла.

— Як жа, — адазваўся стары́ асот, — я расту далей, бачаць мяне людзі радзей, але, мусіць, мае́ шпількі дык даўжэй помняць ад крапіўкі.



Правообладатель Национальный институт образования

Якраз на той час падслухала іх гутарку мала́я Мару́та і кажа:

— Не хваліцеся: абое вы рабое! Матулька казала, што вас абодвух з карэннем вы́дзера.

*Паводле Цёткі.*

1. З-за чаго пасварыліся крапіва з асотам?
2. Як характарызуюць яны сябе ў час гутаркі? Прачытайце адпаведныя радкі з тэксту.
3. Чаму маці Маруты збіраецца вырваць з карэннем асот і крапіву?
4. На якую тэму напісана казка «Гутарка асоту з крапівою»? *(Дружба, прырода, ветлівасць і дабрыня, узаемаадносіны паміж людзьмі, зазнайства нікчэмных людзей).*
5. Якія прыказкі падыходзяць па сэнсе да гэтага твора?
   - *Не хвалі сам сябе, няхай людзі пахваляць.*
   - *Умеў памыліцца, умей і папра́віцца.*
   - *Пасварыліся за мех, а ў мяху смех.*

Падрыхтуйцеся чытаць казку «Гутарка асоту з крапівою» па ролях. Для гэтага алоўкам адзначце ў творы словы пісьменніка (п), крапівы (к), асоту (а) і Маруты (М). Прачытайце казку ў групах.



Правообладатель Национальный институт образования

***Перашко́да*** — тое, што перагароджвае шлях, перапыняе, затрымлівае рух.
***Рэко́рд*** — найлепшы вынік, дасягнуты ў спорце, працы.

## ЧАМУ МЯНЕ НЕ ХВАЛЯЦЬ?

*Іван Муравейка*

Не прызнаю́ я перашкод,
Бо я спартсмен умелы.
Праз плот пралажу, нібы кот,
І пераскочу смела.

І ногі шпаркія мае́:
Калі я разганюся,
Штораз далёка адстае
Любімая бабуся.





Правообладатель Национальный институт образования

На нашай вуліцы ў футбол
Я лепш за ўсіх гуляю:
Не толькі ў вароты гол —
У вокны забіваю.

Такіх рэкордаў, можа, сто
Я дасягнуў за лета.
Але чаму мяне ніхто
Не пахваліў за гэта?

1. Ці спадабаліся вам учынкі хлопчыка з верша Івана Муравейкі? Чаму?
2. Чым ён хваліцца? Прачытайце. Ці можна ўчынкі хлопчыка назваць рэкордамі? Чаму?
3. Як бы вы растлумачылі гэтаму «спартсмену», чаму яго ніхто не пахваліў?
4. На якую тэму напісаны верш? *(Прырода, ветлівасць, добрыя і дрэнныя справы, норма паводзін).*
5. Што хацеў сказаць чытачам аўтар гэтага твора?

Разгледзьце ілюстрацыю да верша. Абмяркуйце, ці ўдалося аўтару паказаць характар хлопчыка. Якія малюнкі яшчэ можна зрабіць да твора?



Правообладатель Национальный институт образования

***Ако́вы*** — тое, што скоўвае, абмяжоўвае каго-небудзь.
***Жахну́цца*** — моцна спалохацца.
***Падстрэ́шша*** — ніжні край страхі́ якога-небудзь будынка.
***Спады́спаду*** — знізу, з ніжняга боку.

## КРОПЕЛЬКА

*Яраслаў Пархута*

Аднаго разу, на зыходзе зімы, сонца прыгрэла мацней звычайнага, і на кончыку ледзяша, які звісаў са страхі́, з’явілася Кропелька. Зірнула Кропелька туды, зірнула сюды і а-бра-да-ва-ла-ся. Ад зімовага сну абуджаўся гародчык, на прызбе сакаталі куры, у небе над хатай звінеў жаваранак. Толькі за вёскай яшчэ спа́ла рачулка, скава́ная тоўстым лёдам.

І рашыла Кропелька дапамагчы рачулцы. Доўга не думала, як гэта зрабіць, — узяла і саскочыла на дол.



Правообладатель Национальный институт образования



На доле ў тым месцы яшчэ гу́рба ляжала. Кропелька пра-ва-лі-ла-ся ў снег, спало-ха-ла-ся і закрычала:

— А-ёй! Ратуйце!

Яе ўчула Другая Кропелька, на дапамогу кінулася, але і сама правалілася ў снег і таксама закрычала:

— Гіну!..

Але тут саскочыла з ледзяша Трэцяя Кропелька і стала суцяшаць:

— Калі будзем трымацца разам, то не загінем, дабяжым да рачулкі.



Правообладатель Национальный институт образования

І Кропелькі адна за адной, ланцужком, пабеглі з-пад снегу. Неўзабаве і на сцежку выбіліся.

— Куды гэта вы? Пачакайце! — гукну́лі з падстрэшша новыя Кропелькі.— І мы з вамі!

Як бачыш, дагналі яны сябровак і прыстро-і-лі-ся. А-тры-ма-ла-ся ручаі́нка.

Ручаінка пазвоньвае на сонцы, бяжыць, стараецца, вуркоча, а прыбегла да рачулкі — жахну́лася: яна ледзь жывая! Хоча скінуць ледзяныя аковы, а не можа. І тады Кропелька, што першай саскочыла з ледзяша, адшукала ў лёдзе трэшчынку і — туды. За ёй у рачулку ўліліся Другая і Трэцяя Кропелькі. Неўзабаве ўся ручаінка была там.



Ці адолеюць Кропелькі перашкоду?
Як закончыцца казка?

Налеглі дружна спа-ды-спа-ду на лёд, і ён не вытрымаў — затрашчаў, на кавал-



Правообладатель Национальный институт образования

кі раскалоўся. Рачулка ўзра-да-ва-ла-ся і пабегла туды, дзе віднелася вялікая рака, яшчэ скаваная тоўстым лёдам.

Жа́варанак пазіраў на ўсё гэта з-пад сонца і вызваньваў:

— Вось што значыць у дружбе жыць! Вось што значыць разам адну добрую справу рабіць!

І маленькая Кропелька вялікую сілу мае — заадно з іншымі!..

1. Якой падзеі абрадавалася Кропелька? Знайдзіце адпаведныя радкі і прачытайце.
2. Чаму Кропелька рашыла дапамагчы рачулцы?
3. Якім чынам усе Кропелькі сталі ручаінкай? Прачытайце адпаведны ўрывак.
4. Ці змаглі Кропелькі перамагчы лёд і вызваліць з-пад яго рачулку? Як гэта адбылося?
5. На якую тэму напісана апавяданне? *(Дружба і ўзаемавыручка, ветлівасць, прырода, дабрыня.)*
6. У якіх сказах выказана галоўная думка твора? Прачытайце іх.



Правообладатель Национальный институт образования

**7.** Якія з прыказак падыходзяць па сэнсе да апавядання Ярослава Пархуты «Кропелька»?

- *Лёгка пасварыцца, цяжэй памірыцца.*
- *Птушка моцная крыламі, а чалавек — дружбай.*
- *Не май сто рублёў, а май сто сяброў.*
- *Дружба мацней каменных сцен.*

**8.** Чым гэты твор нагадвае казку?



**1.** Падзяліце твор на часткі згодна з прапанаваным планам.

П л а н

1. Аднойчы на кончыку ледзяша з'явілася Кропелька.
2. Вырашыла Кропелька дапамагчы рачулцы.
3. На дапамогу кінуліся Другая і Трэцяя Кропелькі.
4. Гукну́лі з падстрэшша новыя Кропелькі.
5. Ручаінка хоча скінуць ледзяныя аковы.
6. Лёд на кавалкі раскалоўся.
7. Словы жаваранка.



**2.** Падрабязна перакажыце змест твора адно аднаму.



Правообладатель Национальный институт образования

***Сіло́*** — прыстасаванне ў выглядзе петляў для лоўлі птушак і дробнай жывёлы.
***На паце́ху*** — на забаву, весялосць.

## ДОБРЫЯ ДЗЕЦІ

*Алесь Гарун*

Паставілі дзеці сіло. Вераб'я
Хацелі злавіць на пацеху.
Злавілі сінічку, крычаць: — Вой-я-я!
А радасці колькі, а смеху!

Імчацца да маткі: — Сінічка, глядзі!
— А дзе ж вы ўзялі́? — Злавілі,
Дастань ты ёй клетку, хутчэй пасадзі.
— Нядобра вы, дзеткі, зрабілі!

— Мы будзем яе і паіць, і карміць,
Спявала б нам птушка прыгожа...
— Ах, дзеткі! У няволі яна замаўчыць,
Спяваць у няволі не можа...

Успомніце толькі, як нудна сядзець,
Як з хаты мароз не пушчае.



Правообладатель Национальный институт образования



То ж дзень, вам здаецца,
як тыдзень ідзе,
Хоць я і ўсяк разважаю.

А птушку вы хочаце з хаткі яе
Узяць, пасадзіць у чужую...
Не мучце, пусціце, рыбулькі мае,
На волю яе, залатую.

І матчыны словы ў сэрцах дзяцей
Ласка́выя струны кранулі,
І добрыя дзеці — пры́клад
для людзей! —
Сініцы свабоду вярнулі.



Правообладатель Национальный институт образования

1. Чаму радаваліся і смяяліся дзеці? Прачытайце.
2. Як да іх забавы аднеслася маці?
3. Якімі словамі маці пераканала дзяцей выпусціць сінічку на волю? Прачытайце адпаведныя радкі з тэксту.
4. Як вы разумееце сэнс наступных радкоў верша?

І матчыны словы ў сэрцах дзяцей
Ласкавыя струны кранулі...

5. На якую тэму напісаны твор?
6. Якія з прыказак падыходзяць да сэнсу верша?
   - *Не трэба салавейку залатая клетка, а трэба салавейку зялёная ветка.*
   - *Усякай птушцы сваё гняздо міла.*
7. Разгледзьце ілюстрацыю да верша. Якія радкі з твора найбольш падыходзяць да гэтага малюнка? Знайдзіце і прачытайце іх.

## Загадка

Чорная шапачка
І палоска шаліка,
Жоўтая спаднічка,
А завуць яе ... .

*Людміла Фядзюк.*





Правообладатель Национальный институт образования

# ВЫРАТАВАЎ

*Ніна Галіноўская*

З гняздзечка ўпала птушаня,
Сядзіць самотнае ў траве.
А дзе бацькі́ яго, радня? —
Ніхто не кліча, не заве.
Паблізу бегае каток,
Вушамі-бантамі стрыжэ.
Заўважыць шэры камячок —
Хто птушанятка ўберажэ?
Хачу яму дапамагчы.
Я пасаджу яго на бэз:





Правообладатель Национальный институт образования

«Сядзь на галінцы і маўчы,
Каб кот на дрэўца не залез.
А па цябе твае бацькі́
Абавязкова прыляцяць».

На бэзе зараз тры шпакі.
І радасць птушак не суняць.

1. Пра які выпадак расказваецца ў вершы?
2. Што прымусіла героя твора ратаваць птушаня?
3. Па чым можна здагадацца, што птушаня засталося жывым? Дакажыце радкамі з верша.
4. Чаму можна павучыцца нам у гэтага хлопчыка?
5. На якую тэму напісаны верш «Выратаваў»? *(Школа, восень, дабрыня, прырода.)*
6. Паразважайце, з якім настроем і тэмпам патрэбна чытаць першую і другую часткі верша? Якія радкі пажадана чытаць шэптам? Чаму?

Параўнайце паводзіны і характары двух галоўных персанажаў з вершаў «Выратаваў» Ніны Галіноўскай і «Чаму мяне не хваляць?» Івана Муравейкі.



Правообладатель Национальный институт образования

## Правер свае дасягненні па тэме «У свеце ветлівасці і дабрыні»

*Ведаю...*

1. З якіх твораў узяты ўрыўкі?

а) Забыўся пра нягоды
І не наўме жуку,
Што абяцаў паднесці
Ён хату слімаку;

б) І матчыны словы ў сэрцах дзяцей
Ласкавыя струны кранулі,
І добрыя дзеці — пры́клад для людзей! —
Сініцы свабоду вярнулі;

в) «І помніце, што толькі наша агульная праца дае вашай кароўцы смачнае малако»;

г) «І маленькая Кропелька вялікую сілу мае — заадно з іншымі!..»;

д) «Дзіма заўсміхаўся. Яму ўпершыню сказалі дзякуй».

2. Назавіце аўтараў наступных радкоў:

а) Не прызнаю́ я перашкод,
бо я спартсмен умелы.



Правообладатель Национальный институт образования

Праз плот пралажу, нібы кот,
і пераскочу смела;

б) «Калі будзем трымацца разам, то не загінем, дабяжым да рачулкі»;

в) «— Мама, а за што кажуць дзякуй?

— За ўсе добрыя справы, за павагу да людзей, — адказала маці. — І табе бабуля падзякавала за тое, што ты ёй, старэнькай, месца ўступіў».

### *Разумею, магу растлумачыць...*

1. Чаму хлопчыка з верша Івана Муравейкі «Чаму мяне не хваляць?» сапраўды ніхто не пахваліў, не паставіў у прыклад?

2. Чаму можна павучыцца ў герояў казкі Ярослава Пархуты «Кропелька»?

3. У чым заключаецца асноўная думка казкі Цёткі «Гутарка асоту з крапівою»?

### *Умею...*

1. Выразна чытаць па ролях верш Максіма Танка «Жук і слімак».

2. Падрабязна пераказваць змест твораў «Кропелька» Ярослава Пархуты і «Каму сказаць дзякуй?» Ядвігі Бяганскай.



Правообладатель Национальный институт образования

3. Складаць невялікае апавяданне па серыі малюнкаў.



*Апорныя словы:* Алесь і Марынка, вярталіся з грыбоў, поўныя кошыкі, каля электрычнага слупа, бела-чорная пляма, паранены буслік, аднеслі да ветэрынара, перабінтаваў крыло, птушку аднеслі дамоў, дапамаглі дзецям, буслік акрыяў, чарада буслоў, пачуў клёкат, узняўся ў неба, з сумам развіталіся, радаваліся за бусліка.



Правообладатель Национальный институт образования

# ПАДАРОЖЖА Ў СВЕТ КАЗКІ



**Мы пазнаёмімся** з беларускімі народнымі казкамі. Даведаемся, чым казка адрозніваецца ад іншых твораў.

**Мы будзем вучыцца:**

- вызначаць у казках герояў і іх рысы характару;
- падрабязна пераказваць асобныя часткі казак;
- складаць казкі па сюжэтных малюнках.

**Варта задумацца:**

Чаму сучаснаму вучню варта вывучаць казкі беларускага народа?



Правообладатель Национальный институт образования

## Маўленчая размінка

Прачытайце і адгадайце загадку. У час чытання правільна вымаўляйце гукі [г], [р], [дз’], [ч].



Не ка**р**оль, а ў ка**р**оне, не **гу**са**р**, а п**р**ы шпо**р**ах, **гадзінніка** не мае, а **час** знае.

**Казка** — твор вуснай народнай творчасці з шырокім выкарыстаннем выдумкі.

Казкі ўзніклі вельмі даўно. Іх склалі таленавітыя людзі з народа. Да з’яўлення пісьме́ннасці казкі перадаваліся і зберагаліся беларусамі ў вуснай форме: з вуснаў у вусны, з пакалення ў пакаленне, з веку ў век.

У змесце беларускіх народных казак часта сустракаюцца словы з памяншальна-ласкальным значэннем: *курачка*, *ліска*, *дзядок*, *сястрыца* і іншыя.



Правообладатель Национальный институт образования

# ЯК КУРАЧКА ПЕЎНІКА РАТАВАЛА

*Беларуская народная казка*

Жылі́-былі́ курачка і пеўнік. Курачка яйкі несла, а пеўнік зярняткі здабываў, курачку частаваў. Выграбе з ямкі зярнятка і кліча курачку:

— Ко-ко-ко, Чубатка, знайшоў зярнятка!

Вось аднойчы вы́граб пеўнік вялікую бобінку.

«Ну, — думае,— гэтага зярняці курачцы не праглыну́ць, з'ем хіба сам».

Праглынуў — ды і падавіўся.





Правообладатель Национальный институт образования

Паваліўся пеўнік, ногі задраў і не дыхае.

Падбегла да яго курачка:

— Што з табою, Пеця? Чаму ты ляжыш і не дыхаеш?

— Ой, — стогне пеўнік, — бобінкай падавіўся...

— Як жа цябе ратаваць, Пеця? — пытаецца курачка.

— Трэба, — шэпча пеўнік, — масла дастаць, горла змазаць.

— А дзе яго дастаць?

— У каровы.

Пабегла курачка да каровы:

— Карова, карова, дай масла!

— Нашто табе масла?

— Пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

— Добра, — кажа карова, — дам табе масла. Але схадзі спярша да касцоў, папрасі сена.

Прыйшла курачка да касцоў:

— Касцы, касцы, дайце сена!



Правообладатель Национальный институт образования

— Нашто табе сена?

— Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Касцы кажуць:

— Схадзі да пекара, папрасі пірагоў. Пірагі мы з'ядзім, тады і сена накосім.

Прыйшла курачка да пекара:

— Пекар, пекар, дай пірагоў!

— Нашто табе пірагі?

— Пірагі — касцам. Касцы накосяць сена. Сена — карове. Карова дасць масла. Масла — пеўніку, бо пеўнік ляжыць і не дыхае: бобінкай падавіўся.

Пекар кажа:

— Збегай у лес, прынясі дроў, каб было на чым пірагі пячы.

Пабегла курачка ў лес і прынесла дроў.

Пекар напёк пірагоў.

---

Як могуць развівацца далей падзеі ў казцы? Як казка закончыцца?

---



Правообладатель Национальный институт образования

Занесла курачка пірагі касцам. Касцы з'елі пірагі і накасілі сена.

Прынесла курачка сена карове.

Карова з'ела сена і дала масла.

Пеўнік змазаў маслам горла і праглынуў бобінку.

Праглынуў і зноў весела на ўвесь двор заспяваў:

— Ку-ка-рэ-ку! Чуб-чубатка — маладзец!

Тут і казцы канец.

1. Якая бяда здарылася з пеўнікам?
2. Ці спадабалася вам курачка? Чаму?
3. Да каго звярталася Чубатка за дапамогай? Што зрабілі персанажы казкі, каб выратаваць пеўніка?
4. Чаму Чубатцы ўдалося ўратаваць пеўніка?
5. Якімі словамі пачынаецца і заканчваецца гэта казка?
6. Якія прыказкі падыходзяць да зместу казкі?
   - *Сябры пазнаюцца ў бядзе.*
   - *Той не можа быць другам, хто ў бядзе абыдзе кругам.*
   - *Шчыраму сэрцу і чужы боль баліць.*



Правообладатель Национальный институт образования

Разгледзьце малюнкі да казкі. Падрабязна перакажыце адно аднаму яе змест па малюнках.

 

 

Казкі ў большасці пачынаюцца словамі «жылí-былí». Такі пачатак называецца **зачы́нам.**

Заканчваецца твор словамі: «Тут і казцы канец». Гэта **канцоўка.** А тэкст, які знаходзіцца паміж зачынам і канцоўкай, называецца **асноўнай часткай.**

Будова беларускай народнай казкі:

Зачын → Асноўная частка → Канцоўка



Правообладатель Национальный институт образования

***Паве́тка*** — пляцоўка пад дахам на слупах для захавання чаго-небудзь ад непагоды.
***Шпацырава́ць*** — прагульвацца.
***Цэп*** — ручная драўляная прылада для малацьбы збожжа.
***Па́рабак*** — наёмны работнік у багатага чалавека.
***Ток*** — пляцоўка для абмалоту збожжа.
***Пара́да*** — прапанова, як дзейнічаць.
***Дзяжа́*** — драўляная пасудзіна, у якой рашчынялі цеста.
***Млын*** — гаспадарчае збудаванне, абсталяванае механізмам, які меле зерне на муку.

## ПШАНІЧНЫ КАЛАСОК

*Беларуская народная казка*

Жылі на адным двары курачка Сакатушка, гусак Шыпун ды індык Балбатун.

Курачка даглядала сваіх куранятак, грэблася на сметніку, шукала зярняткі. А гусак Шыпун і індык Балбатун толькі шпацырава́лі ўзад і ўперад па двары, як



Правообладатель Национальный институт образования

важныя паны, ды заўсёды вялі між сабою спрэчкі аб тым, хто з іх важнейшы і разумнейшы.

— У мяне галава большая, — хваліўся гусак, — дык і розуму ў ёй больш!

Індык з гэтым не згаджаўся.

— Галава ў цябе вялікая, гэта праўда, ды дурная як бот, — казаў ён.

— Ну, няхай сабе галава дурная, — адказваў гусак, — затое нос які ў мяне! Моцны, цвёрды, прыгожы... А ў цябе што за нос — смех адзін! Чарвяк, а не нос!

І гусак, і індык былі страшэнныя гультаі. Яды шукаць сабе ленаваліся і таму часта галадалі. Каб не карміла іх сяды́-тады́ гаспадыня, дык даўно б гультаёў і на свеце не было.

Аднаго разу знайшла курачка каля плота пшанічны каласок. Зарадавалася, засакатала на ўвесь двор:

— Ко-ко-ко! Глядзіце, які цудоўны каласок я знайшла!

Пачулі пра тую навіну́ Шыпун і Балбатун.



Правообладатель Национальный институт образования

— Ану, пакажы!

Курачка паказала ім каласок. Індык панюхаў каласок сваім носам-чарвяком.

— Так, так, — сказаў ён, — каласок і праўда цудоўны. Трэба яго змалаціць.

— Ага, ага, — згадзіўся і гусак. — Трэба змалаціць. Тады будуць зярняткі. А яны смачныя... Ага, ага!

— Добра, — сказала курачка. — А хто яго змалоціць?

— Толькі не я! — адказаў гусак. — Я тоўсты, мне цяжка цэпам махаць.

— Дык што ж, ты хочаш, каб я малаціў? — горача забалбатаў індык. — Я табе не парабак.

— Ну, добра, — сказала курачка, — я сама змалачу́.

Пайшла яна на ток, узяла цэп і змалаціла пшанічны каласок. Прынесла зярняткі і цешыцца:

— Глядзіце, якія цудоўныя зярняткі! Чырванава́ценькія, пузаценькія! Яны, напэўна, смачнейшыя за ячменныя.



Правообладатель Национальный институт образования

Падышлі да зярнятак і гусак з індыком.

— Так, так, — сказаў індык. — Цудоўныя зярняткі.

— Ага, ага, — пацвердзіў гусак. — Аж шкада дзяўбці.

— І не трэба дзяўбці. Іх трэба змалоць ды напячы булак, — даў разумную параду індык.

— Ага, ага, — згадзіўся гусак. — Пшанічныя булкі мяккія, як мой пух. А смачныя якія!

— Добра, — сказала курачка. — А хто змеле пшанічныя зярняткі?

— Толькі не я! — буркнуў гусак. — Мне цяжка ў млын хадзіць.

— І не я! — усклікнуў індык. — З такою простаю работаю і дурны гусак справіцца.

— Ну што ж, — сказала курачка, — калі так, то давядзецца мне самой ісці ў млын.

Усыпала яна зярняткі ў торбачку і панесла ў млын. Там змалола і прынесла му́ку дахаты.



Правообладатель Национальный институт образования

— Ай, якая бялюткая мука́! — засакатала курачка на ўвесь двор.

Індык панюхаў муку́.

— Так, так, — сказаў ён, — добра пахне. Значыць, смачныя будуць булкі.

— Ага, ага, я ж казаў, што смачныя! — уставіў слова і гусак.

— Ну, а хто спячэ з гэтай мукі булкі? — запыталася курачка.

Гусак пакруціў галавою:

— Я не ўмею.

Індык адказаў:

— Я хоць і ўмею, ды не хачу. Няхай гусак пячэ.

— Ну, добра, — сказала курачка, — тады я сама спяку.

Знайшла яна пад паветкаю дзежачку і рашчыніла цеста. Потым накалола дроў і запаліла ў печы. Калі цеста падышло, курачка нарабіла круглых прыгожых булак і пасадзіла іх на лапаце ў печ.

Булкі пачалі пячыся. І такі прыемны пах пайшоў ад іх па ўсім двары, што ў гусака і індыка́ аж слінкі пацяклі.



Правообладатель Национальный институт образования

А трэба сказаць, што яны даўно нічога не елі і так вы́галадаліся, што нават спрачацца перасталі, хто з іх важнейшы ды разумнейшы.

— Хадзем у хату, — сказаў індык, — відаць, булкі ўжо гатовы.

— Ага, ага, — адказаў гусак. — Хадзем, брат, у хату.

Прыйшлі індык з гусаком у хату, а там курачка булкі з печы дастае. Мяккія, румяныя, пахучыя.

— Так, так, — весела загаварыў індык, — якраз у пару́ прыйшлі.

— Ага, ага, — זаківаў галавою гусак і першы падаўся за стол. Індык — за ім.



Ці пачастуе курачка гусака і індыка булачкамі? Чаму?

Але курачка спыніла іх:

— Чакайце! Не спяшайцеся, панове! Перш чым садзіцца за стол, адкажыце мне на мае́ пытанні.



Правообладатель Национальный институт образования



— Давай свае пытанні! — сярдзіта прашыпеў гусак. — Толькі хутчэй.

— Але, толькі хутчэй, — шпарка забалбатаў і індык. — А то дужа есці хочацца...

— Дык слухайце! Хто пшанічны каласок знайшоў?

— Ты, курачка, вядома, ты знайшла, — адказалі індык і гусак у адзін голас.

— Хто змалаціў каласок?

— Ты, курачка, змалаціла.

— Хто зярняткі ў млын насіў?

— Ты насіла...

— А хто дровы сек, у печы паліў, пшанічныя булкі пёк?



Правообладатель Национальный институт образования

Пераглянуліся паміж сабою індык з гусаком і адказалі:

— Ты, вядома... За гэта табе і слава.

— Дык вось, — сказала курачка Сакатушка, — каму слава, таму і булкі. А вы, гультаі, ідзіце прэч адгэтуль! Ко-ко-ко! Дзеткі, бяжыце сюды хутчэй.

Пазбягаліся з двара куранятки і пачалі з курачкай частавацца свежымі пшанічнымі булкамі.

А галодныя гультаі індык і гусак зноў заспрачаліся, хто з іх важнейшы ды разумнейшы.

1. Пра каго расказваецца ў казцы?
2. Ці спадабаліся вам паводзіны гусака і індыка́? Чаму? Выберыце словы для іх характарыстыкі: *працавітыя, клапатлівыя, старанныя, гультаі, ганарлівыя*.
3. Якой паўстала перад намі курачка Сакатушка?
4. Каго з персанажаў казачнік услаўляе? Чаму?
5. Хто ў казцы высмейваецца? За што?
6. Вылучыце ў тэксце словы курачкі, гусака, індыка. Прачытайце тэкст па ролях.



Правообладатель Национальный институт образования

**1.** Пазнаёмцеся са старажытным працэсам выпечкі хлеба.

1. Трэба спачатку каласкі на таку абмалаціць.
2. У млыне змалоць пшанічныя зярняткі на муку́.
3. Рашчыніць з мукі́ цеста і пачакаць, пакуль яно падыдзе.
4. Насекчы дроў і напаліць імі печ, каб яна была гарачай.
5. Нарабіць з цеста круглых прыгожых булак.
6. Пасадзіць іх на драўлянай лапаце ў печ і пачакаць, пакуль спячэцца хлеб.

**2.** Падрабязна перакажыце паслядоўнасць выпечкі хлеба.

**У беларускіх народных казках вобразы жывёл сустракаюцца даволі часта. Ліса ўвасабляе сабою хітрасць (хітры як ліса); зайчык — баязлівасць (дрыжыць як заяц); воўк — жорсткасць і зло (злы як воўк); мядзведзь — сілу і нязграбнасць (дужы як мядзведзь).**



Правообладатель Национальный институт образования

***Кру́пнік*** — крупяны суп.

## КОЦІК, ПЕЎНІК І ЛІСІЦА

*Беларуская народная казка*
*(Скарочана)*

Жылі́-былі́ Коцік і Пеўнік. Добра жылі, дружна. Коцік на паляванне хадзіў, а Пеўнік абед варыў, хатку падмятаў, песні спяваў.

Аднойчы пайшоў Коцік на паляванне, а Пеўнік зачыніў за ім дзверы ды пачаў абед варыць.

Бяжыць Лісіца, убачыла хатку, падскочыла да акенца:

— Гэй, хто тут гаспадар?

— Я, — кажа Пеўнік.

— Пусці ў хату.

— Чаго?

— Пасяджу трохі, адпачну з дарогі.



Правообладатель Национальный институт образования

Пеўнік добры быў, пусціў Лісіцу ў хатку. А Лісіца — цап! — ухапіла яго і панесла дадому.

Апамятаўся Пеўнік, закрычаў на ўвесь лес:

— Коце, браце!
Мяне Ліска нясе
ў высокія горы,
у глыбокія норы,
па барах, па карчах,
аж бярэ мяне страх!..

Пачуў гэта Коцік, прыбег, адабраў у Лісіцы Пеўніка і завёў яго назад у хатку.

— Ну, — кажа, — глядзі ж, другі раз не пускай Лісіцу, бо цяпер я дале́й пайду і магу не пачуць цябе.

— Добра, — кажа Пеўнік, — не пушчу.

Зноў пайшоў Коцік на паляванне.

А Лісіца тут як тут:

— Пеўнік, галубок, разумны лабок, адчыні!

— Чаго табе трэба?

— Пазыч агню.

— Навошта?



Правообладатель Национальный институт образования



— Буду ў печы паліць.

— Не адчыню, бо ты схопіш мяне.

— Ды не, больш не буду хапаць.

Паверыў Пеўнік Лісіцы і адчыніў дзверы. А тая ўхапіла яго і панесла.

Пеўнік зноў пачаў клікаць Коціка.

Добра, што Коцік далёка не адышоўся ад дому: пачуў ён Пеўніка, прыбег і адабраў яго ад Лісіцы.

— Ну, — кажа ён Пеўніку, — калі ты і трэці раз адчыніш Лісіцы дзверы, то бяда табе будзе: цяпер я пайду на паляванне яшчэ далей.

— Не, — кажа Пеўнік, — больш я гэтай зладзейцы дзвярэй не адчыню.



Правообладатель Национальный институт образования

— Глядзі ж!

І Коцік пайшоў у самыя далёкія лясы.

Прыбегла Лісіца:

— Пеўнік, галубок, разумны лабок, дай вугалёк!

— Не, цяпер я дзверы табе не адчыню!

— Дык ты праз акенца падáй.

— Праз акенца можна, — згадзіўся Пеўнік.

Адчыніў ён акенца, а Лісіца ўхапіла яго і панесла.

Крычаў, крычаў Пеўнік, ды Коцік яго так і не пачуў: вельмі ж далёка ён зайшоў.

Прынесла Лісіца Пеўніка дахаты і загадала дочкам у печы паліць, з Пеўніка крýпнік вары́ць. А сама пайшла гасцей склікаць.

Вярнуўся з палявання Коцік, бачыць — няма Пеўніка. «Мусіць, яго зноў Лісіца ўхапіла, — падумаў Коцік. — Як жа яго цяпер з бяды выратаваць?»



Ці ўдасца Коціку і на гэты раз уратаваць Пеўніка? Якім чынам?



Правообладатель Национальный институт образования



Зрабіў ён скрыпачку галасістую ды пайшоў да Лісіцы.

Прыйшоў, сеў ля варот і зайграў, прыпяваючы:

— Тылі-тылі, скрыпіца,
Тут сядзела Лісіца,
А ў Лісіцы
Новы двор,
Сем дачушак
На выбор.
Восьмы Пеўнік —
Гэта мой!

Пачулі лісíцыны дочкі мýзыку і кажуць:

— Як хараша нехта іграе. Бяжым паслухаем, а Пеўніка зварыць яшчэ паспеем.



Правообладатель Национальный институт образования

Выбеглі яны на двор ды і заслухаліся.

Пеўнік жа тым часам не драмаў: выскачыў з лісіцынай хаткі ды пабег з Коцікам дадому.

Так і засталася Лісіца ні з чым.

1. Пра каго расказваецца ў гэтай казцы?
2. Хто з персанажаў вам спадабаўся найбольш? Чаму?
3. Ці спадабаліся вам учынкі Лісіцы? Як вы ацэньваеце іх?
4. Аб чым вымушае задумацца казка?
5. Знайдзіце ў казцы зачын, асноўную частку і канцоўку.
6. Да якога эпізода казкі зроблены малюнак, змешчаны на с. 97? Перакажыце па малюнку адпаведны ўрывак з твора.

1. Падзяліце казку «Коцік, Пеўнік і Лісіца» на 4 сэнсавыя часткі. Дайце ім загалоўкі.
2. Падрабязна перакажыце змест казкі.



Правообладатель Национальный институт образования

***След прасты́ў*** — знік.
***Ліслі́вы (голас)*** — з дапамогай якога можна дагадзіць каму-небудзь з карысцю для сябе.
***Сме́тнік*** — месца, куды выкідаюць смецце, непрыгодныя і непатрэбныя рэчы.
***Спажы́ва*** — тое, чым можна пажывіцца; корм.
***Цікава́ць*** — пільна за кім-небудзь ці чым-небудзь сачыць.

## ГАНАРЫСТАЯ ВАРОНА

*Беларуская народная казка*

Раска́ркалася неяк увосень адна варона на сметніку:

— Вы сабе як хочаце, — кажа сяброўкам, — а я не магу тут цэлую зіму мерзнуць. Я не такая дурная варона, як вы!

— А што ж ты думаеш рабіць, разумная? — пытаюцца сяброўкі.

— Палячу за мора: там, кажуць, зімы не бывае.



Правообладатель Национальный институт образования

— Ну што ж, — паківалі галовамі сяброўкі, — шчаслівай табе дарогі. А мы ўжо як-небудзь і дома перазімуем.

Сабра́лася ганарыстая варона і паляцела за мора.

Доўга ляцела ці нядоўга, аж бачыць — пад ёю ўжо не вада, а зямля зялёная, зверху цёплае сонейка свеціць.

«Ну, — думае варона, — тут я спынюся». Апусцілася на высокае дрэва ды пачала выглядаць спажы́ву: вы́галададалася ж, нябось, за дарогу.

Убачылі варону заморскія птушкі.

— Хто ты? — пытаюцца. — Ніколі мы ў сваіх краях такой птушкі не бачылі. Можа, ты паўночны салавей? Ён, кажуць, пяе, як званочак звініць.

— Але, але, — падхапіла варона. — Я — паўночны салавей!

А сама сабе думае: «Хіба я горш за салаўя спяваю? Чаму ж толькі яму гонар і павага?»

Зарадаваліся заморскія птушкі.



Правообладатель Национальный институт образования

— Паспявай нам, паўночны салавейка! — просяць варону. — А мы паслухаем. Вельмі ж хочацца нам твой голас пачуць.

Задрала варона ўгору сваю дзюбу і заспявала на ўсё горла:

— Кар-кар-р! Кра-кра! Гэй, гэй! Я — паўночны салавей!

Пераглядваюцца птушкі паміж сабою, вушы лапкамі затыкаюць. «А няхай яго з такім салаўём! — шэпчуць. — Ён жа не лепш за звычайную жабу спявае...»

А потым не вытрымалі слухачы, гуртам наляцелі на варону і давай яе дзяўбці, давай таўчы. Амаль не ўсё пер’е вы́скублі.

— Выбірайся, — крычаць, — прэч са сваімі песнямі! Не хочам мы цябе слухаць.

Вырвалася варона ад няўдзячных слухачоў і паляцела назад дадому.

А тут скора і вясна настала. Рэкі ад лёду ачысціліся. Не захацела варона на сметнік варочацца. Паляцела на рэчку. Села там на беразе і ціку́е за рыбамі.



Правообладатель Национальный институт образования



Бачыць: паўзе рак. Ну, голад не цётка: калі няма рыбы, то і рак — рыба. Схапіла яна ра́ка і сабралася ўжо снедаць, як раптам чуе ліслівы ра́каў галасок:

— Вось добра, што трапіў у дзюбу не якой-небудзь чорнай галцы або граку́, а самой пані вароне. Як жа мне пашанцавала! Ты ж такая прыгажуня, такая красуня, што і сказаць няможна. Шэрыя пёркі твае аж зіхацяць на сонейку. А галасок у цябе — як у таго салаўя, не раўнуючы: як пачнеш спяваць — дык на цэлы свет чуваць. Я не раз захапляўся тваімі цудоўнымі песнямі, у цёмнай нары седзячы.



Правообладатель Национальный институт образования

Хацеў бы я, пані варона, пачуць тваю песню яшчэ раз.

— Праўда, праўда! — каркнула ўзрадаваная ад пахвалы варона. — Гэта толькі дурныя заморскія птушкі зга́нілі мяне. Ну дык слухай!

І завяла варона на ўсю ваколіцу:

— Кар-кар-р! Кра-кра! Я не простая варона!

Скончыла спяваць, глядзіць — а ра́ка і след прастыў.

Давялося ганарыстай і галоднай вароне зноў на сметнік да сябровак ляцець.

1. Чаму варона сабралася ляцець за мора?
2. Як заморскія птушкі спачатку прынялі госцю? З-за чаго потым прагналі яе?
3. Ці спадабалася вам ганарыстая варона? Чаму?
4. Што высмейвае беларускі народ у гэтай казцы?
5. Якія з выразаў падыходзяць для характарыстыкі вароны?
   - *Крукам носа не дастаць.*
   - *Пустой птушкі — пустая і песня.*
   - *Высока падляцела, ды нізка села.*



Правообладатель Национальный институт образования

***Палу́скваюць*** — патрэскваюць.
***Падаро́жны*** — той, хто знаходзіцца ў дарозе, падарожнічае; вандроўнік.
***Селяні́н*** — жыхар вёскі, сяла.
***Зу́хаўскі*** *(вазок)* — удалы.
***Пан*** — уладальнік маёнтка, памешчык.
***Паўвярсты́*** — мера даўжыні, прыкладна паўкіламетра.
***Кро́сны*** *(ткаць)* — тут: пакрываць кажух інеем, нібыта ніткамі.
***Пугаўё*** — палка, да якой прывязваюць кавалак вяроўкі, каб паганяць жывёлу.
***Даць дра́ла*** — пусціцца наўцёкі.

## ДВА МАРАЗЫ

*Беларуская народная казка*

Гулялі па полі два маразы, два родныя браты — Мароз Сіні Нос і Мароз Чырвоны Нос.

Гуляюць-пагульваюць маразы, адзін аднаго пахвальваюць. А ноч ясная-ясная. Прасторна маразам на волі.



Правообладатель Национальный институт образования

А ціха, так ціха, нібы жывой душы не засталося на свеце. Перабеглі маразы з поля на лес. Бегаюць, палускваюць, з дрэва на дрэва пераскокваюць, зайчыкаў палохаюць. З лесу ў вёску заскочылі і давай па даху страляць.

— Эге, — кажа Мароз Сіні Нос, — усе пахаваліся, баяцца на двор вылезці.

— Няхай толькі вылезе хто — задамо яму стра́ху, — адказвае Мароз Чырвоны Нос.

Пачало развідняцца. Паваліў з каміноў дым густы. Заскрыпелі калодзежы. Павыходзілі мужчыны з хат. Хто малаціць пайшоў, хто ў лес па дровы збіраецца.





Правообладатель Национальный институт образования

— Стой жа, брат, — сказаў Мароз Чырвоны Нос. — Пабяжым мы на дарогу ў поле.

І пабеглі яны зноў у поле. Стаяць, прытуліўшыся, падарожных чакаюць.

Заскрыпелі сані на дарозе. Зазваніў дзесь званочак пад дугою.

У саня́х селянін сядзіць, коніка паганяе. А ззаду за ім зу́хаўскі вазок плыве, званочак пазвоньвае.

— Ну, чакайце ж вы! — кажа Мароз Сіні Нос. — Ты бяжы за мужыком, а я за панам паганюся.

І пабеглі яны падарожных марозіць.

Доўга бег Мароз Сіні Нос, пакуль пана дагнаў. Нарэшце дагнаў, пад футра залез, цяпло выганяе адтуль. Пацiска́ецца пан, ногі зябнуць, холад па целе пайшоў, панскі нос пасінеў. А Мароз Сіні Нос толькі пасмейваецца. Ледзь да смерці пана не замарозіў.

А Мароз Чырвоны Нос дагнаў селяніна і давай яго марозіць.

— Эге, мароз не жартуе, — кажа селянін.



Правообладатель Национальный институт образования

Злез ён з саней, бяжыць, нагамі тупае, рукамі аб плечы б’е. Прабег так з паўвярсты, аж горача стала яму. Сеў сабе на сані, едзе — і гора мала.

— Ну, пачакай жа, брат: прайму я цябе, як ты дровы секчы будзеш.

Заехаў чалавек у лес. А Мароз Чырвоны Нос вы́перадзіў яго, у лесе чакае. Выпраг коніка селянін, сякеру ўзяў ды як пачаў секчы — горача стала яму. Скінуў кажух. А Мароз і ўзрадаваўся: залез у кажух і давай там белыя кросны ткаць.

Зрабіўся кажух белы як снег. Насек дроў чалавек, да кажуха ідзе, а ён увесь абмёрз.

— Эге, браток, дык ты тут?





Правообладатель Национальный институт образования

Узяў пугаўё ды як пачаў малаціць — ледзь жывы выскачыў Мароз Чырвоны Нос ды драла ў лес.

Узлаваўся Мароз Чырвоны Нос на селяніна, але ніякай рады даць яму не можа.



1. Якімі здольнасцямі валодалі два браты — Мароз Сіні Нос і Мароз Чырвоны Нос? Прачытайце адпаведныя радкі тэксту.
2. Чаму людзі, нягледзячы на моцныя маразы, усё роўна ішлі абмалочваць збожжа ці ехалі ў лес па дровы?
3. Ці ўдалося Марозу Сіняму Носу замарозіць пана? Як гэта адбылося?
4. Растлумачце значэнне выразу «ніякай рады даць яму не можа».
5. Чаму селянін два разы выйшаў пераможцам у змаганні з Марозам Чырвоным Носам?
6. Якіх людзей услаўляе казачнік у гэтым творы?
7. Разгледзьце ілюстрацыі да казкі. Якія эпізоды з твора адлюстраваў на іх мастак?



1. Падзяліце казку «Два маразы» на 4 часткі згодна з прапанаваным планам.



Правообладатель Национальный институт образования

П л а н

1. Гулялі па полі два маразы.
2. Наступіла раніца.
3. Як Мароз Сіні Нос пана марозіў.
4. Як селянін ад Мароза Чырвонага Носа адбіваўся.



**2.** Падрабязна перакажыце змест казкі па плане.

## Правер свае дасягненні па тэме «Падарожжа ў свет казкі»

***Ведаю...***

1. У якой казцы дзейнічаюць наступныя персанажы: пеўнік, курачка Чубатка, карова, касцы́ і пекар?

2. З якой казкі наступныя словы: «Каму слава, таму і булкі. А вы, гультаі, ідзіце прэч адгэтуль!»? Хто іх гаварыў і каму?

3. У якой казцы ўслаўляецца дружба паміж свойскай жывёлай, клопат адзін аб адным, уменне выратаваць з бяды?

4. Як называецца твор, у якім казачнік смяецца з гультайства і невуцтва гусака і індыка?



Правообладатель Национальный институт образования

5. На вобразе якой птушкі высмейваецца ганарлівасць людзей, імкненне праславіцца? Як называецца гэта казка?

6. Хто са звяроў у беларускіх народных казках хітры? Баязлівы? А хто злы? *(Кот, сабака, заяц, ліса, воўк, мядзведзь.)*

7. З якіх частак складаецца беларуская народная казка?

8. Разгледзьце ілюстрацыі да вядомых казак. Пазнайце дзейных асоб, што адлюстраваны. З якіх яны казак?













Правообладатель Национальный институт образования

## *Разумею, магу растлумачыць...*

1. Чаму казка — гэта твор вуснай народнай творчасці?

2. Якія персанажы найчасцей дзейнічаюць у змесце беларускіх народных казак?

3. З-за чаго пеўнік з казкі «Коцік, Пеўнік і Лісіца» ўвесь час пападáецца ў лапы хітрай Лісіцы?

4. Да зместу якой казкі падыходзяць наступныя прыказкі?

- *Гультайства горш за хваробу.*
- *Пад ляжачы камень вада не бяжыць.*
- *На языку — хоць куды, а на працы — нікуды́.*
- *Без працы не есці пірагоў.*
- *Хто працуе, той і мáе.*

## *Умею...*

1. Падрабязна пераказваць змест прачытанай беларускай народнай казкі, якая найбольш спадабалася і запомнілася.

2. Знаходзіць у казцы «Пшанічны каласок» зачын, асноўную частку і канцоўку.



Правообладатель Национальный институт образования

3. Па малюнках і апорных словах прыдумваць казку.



А п о р н ы я  с л о в ы: паляванне, яблыневы сад, упаў яблык, пабеглі наперагонкі, пачуўся шум, усчалася бойка, ляцелі пер’е і пух, падыходзіў Мядзведзь, патрымаў у лапах, селі на пянёчак, дзеліць яблык, усе задаволены.

Правообладатель Национальный институт образования

# ЗІМОВЫЯ ПРЫГОДЫ



**Мы пазнаёмімся** з цікавымі вершамі, апавяданнямі і казкамі пра зімовыя змены ў прыродзе, працу і адпачынак зімой.

**Мы будзем вучыцца:**

- вызначаць настрой вершаў пра зіму;
- выказваць уласныя адносіны да зместу твораў;
- знаходзіць у вершах і апавяданнях апісанне карцін зімовай прыроды.

**Варта задумацца:**

Чым захапляе беларускіх пісьменнікаў зіма? Якім зімовым вобразам яны найчасцей аддаюць перавагу?



Правообладатель Национальный институт образования

***Непасе́да*** — тут: дзіця, якое не можа ўседзець на месцы.

## З ПЕРШЫМ СНЕГАМ!

*Юрась Свірка*



З першым снегам,
З першым снегам!
Зноў на горку вам пара.
З першым снегам,
З першым снегам,
Дзеці нашага двара!

Снегам чыстым,
Лёдам чыстым
Пачынаем кожны год.



Правообладатель Национальный институт образования

Снег бялюткі,
Снег іскрысты.
Як люстэрка, гладкі лёд.

З першым снегам,
З першым снегам,
Не сядзіцца дзетвары.
Звонкім смехам,
Звонкім смехам
Напаўняюцца двары.

З першым снегам,
З першым снегам,
Непаседы-дружбакі!
З лёгкім бегам,
З лёгкім бегам,
Санкі, лыжы і канькі!

1. Які настрой выклікаў у вас гэты верш? Чаму?
2. Як паэт апісвае снег і лёд? Прачытайце адпаведныя радкі.
3. Знайдзіце і прачытайце ў вершы словы, якія паўтараюцца.
4. Якія зімовыя забавы дзяцей узгадваюцца ў творы?



Правообладатель Национальный институт образования

5. На якую тэму напісаны верш «З першым снегам!»? *(Дружба, з'явы прыроды, дабрыня, узаемаадносіны паміж людзьмі.)*
6. Ці падабаецца паэту першы снег? Дакажыце словамі з твора.
7. Разгледзьце ілюстрацыю да верша. Што на ёй паказаў мастак? Паразважайце, ці ўдалося яму перадаць настрой твора? Чаму?
8. Прачытайце верш самі сабе і падрыхтуйцеся да выразнага чытання ўголас. Пры чытанні перадайце радасны і вясёлы настрой.



*Аркадзь Пластоў*. Першы снег



Правообладатель Национальный институт образования

Разгледзьце рэпрадукцыю карціны Аркадзя Пластова «Першы снег». Адкажыце на пытанні.

1. Каго і што адлюстраваў мастак на гэтай карціне?
2. Па чым можна здагадацца, што дзяўчынка і хлопчык — гэта, хутчэй за ўсё, сястрычка і брацік? Як вы думаеце, хто з іх старэйшы?
3. Што з напісанага на карціне найбольш прыцягнула вашу ўвагу? Патлумачце.
4. Што прымусіла дзяцей хутка пакінуць цёплае памяшканне і выйсці на вуліцу?
5. Чаму яны прыпыніліся на ганку, а не прайшлі далей?
6. Якіх колераў — светлых ці цёмных — на палатне больш?
7. Чаму мастак намаляваў хустку на галаве дзяўчынкі жоўтым колерам? Што жоўты колер можа ўвасабляць?
8. Чаму карціна «Першы снег», нягледзячы на перавагу больш цёмных колераў, выклікае ў нас цеплыню і радасць?


Правообладатель Национальный институт образования

***Шы́ба*** — аконнае шкло.
***Скуго́ліць*** — жаласна выць, падвываць.
***Сту́дня*** — калодзеж.
***Га́нак*** — прыбудова перад уваходам у дом у выглядзе пляцоўкі з прыступкамі.

## ПРА КАЗАЧНЫХ ЧАЛАВЕЧКАЎ

*Ядвіга Бяганская*

Мароз намаляваў на шы́бах акон свае дзівосныя белыя ўзоры, рассыпаў вясёлыя агеньчыкі. Шуміць за сцяной вецер, гудзепадвывае ў коміне.

— Бабуля, раскажы нам казку, — просіць Зося.

— Толькі вясёлую, бабуля, такую, каб вецер перастаў скуголіць ды каб сон харошы прысніўся, — гаворыць Толік.

Бабуля адкладвае ўбок шытво. Добрая ўсмешка расплываецца ў яе тонкіх зморшчынках.

— Якую ж вам казку расказаць? — пытае бабулька. — Раскажу вам хіба пра ма-



Правообладатель Национальный институт образования

ленькіх казачных чалавечкаў. Ну дык вось, слухайце. Жыў ды быў на свеце адзін шавец, — пачала сваю казку бабуля. — І так ён збяднеў, так збяднеў, што застаўся ў яго толькі невялікі кавалак скуры. «Вы́краю я з гэтай скуры па́ру чараві́каў, а заўтра раніцай вазьмуся за шытво», — падумаў шавец і лёг спаць. Раніцай ён устаў і хацеў ужо за работу ўзяцца, аж бачыць — стаяць у яго на стале гатовыя чаравікі, ды такія прыгожыя, якіх ён зроду не бачыў. Прадаў шавец чаравікі і купіў на гэтыя грошы тавару, з якога скроіў аж тры пары чаравікаў. Раніцай устаў, а чаравікі зноў стаяць гатовыя. Так і пайшло з таго часу: колькі пар чаравікаў скроіць шавец — раніцай яны стаяць гатовыя. «Трэба падпільнаваць, хто гэта ўначы мне чаравікі шые», — падумаў шавец. Схаваўся ён за печ і чакае. І вось апоўначы з'явіліся маленькія чалавечкі, селі за шавецкі столік і пачалі шыць чаравікі. А як скончылі работу, адразу зніклі.



Правообладатель Национальный институт образования

* * *

Шмат цікавага расказала бабулька ў гэты вечар пра маленькіх казачных чалавечкаў.

— Бабулька, а ты б хацела мець такіх памочнікаў? — запытаў Толік.

— Вядома, унучак, хацела б, — сказала бабуля...

Лежачы ў сваім ложку, Зося пазірала на далёкія ясныя зоркі і думала пра маленькіх казачных чалавечкаў. «А што, калі я і Толік...»

Праз хвіліну Толік ужо сядзеў побач з сястрой на яе ложку. Аб чым яны шапталіся — невядома...

---

Як будуць развівацца падзеі далей?

---

А раніцою ўстала бабуля, сабралася ісці па дровы, а яны ўжо ляжаць каля печы. Хацела яна па ваду да сту́дні пайсці — аж вада сама ў хату прыйшла: стаіць вядро на лаве паўнюткае ды сваім блакітным вокам на гаспадыню пазірае. Выйшла ба-



Правообладатель Национальный институт образования



буля на ганак і вачам не верыць: нехта на сцежках снег паразмятаў ды пясочкам іх прысы́паў, каб не коўзка было хадзіць. Пайшла яна пасля снедання па малако да суседкі, а пакуль хадзіла, нехта са стала прыбраў і падлогу падмёў.

Дзівіцца бабуля, галавой ківае, усміхаецца, а Зося з Толікам за ёю цішком назіраюць ды хітра падміргваюць адно аднаму. Цікавую гульню прыдумала Зося.

І бабуля рада, што ў яе з'явіліся маленькія казачныя чалавечкі.

1. У якую пару года адбываюцца падзеі, апісаныя ў апавяданні? Пацвердзіце сваю думку адпаведнымі радкамі.



Правообладатель Национальный институт образования

2. Як Зося і Толік бавілі час зімовымі вечарамі?
3. Пра каго расказала бабуля сваю казку? Перакажыце яе змест.
4. Якую цікавую ідэю падказала ўнукам бабуліна казка?
5. Чаму, на вашу думку, пісьменніца падзяліла апавяданне на дзве часткі? Падбярыце загалоўкі да іх.
6. Раскрыйце сэнс назвы твора.
7. Які момант паказаў мастак на малюнку? Абмяркуйце, якія яшчэ ілюстрацыі можна зрабіць да апавядання.

## НА ГОРЦЫ

*Алесь Ставер*

Мне купілі санкі,
Санкі-самакаты.
І пабеглі шпарка
Мы на горку з братам.
Снежныя падушкі
Беллю вабяць вока...
Мы ляцім, бы птушкі,
Мы ляцім далёка.



Правообладатель Национальный институт образования

Як у небе зоркі,
Снег вакол іскрыцца.
Эх, на санках з горкі
Хораша пусціцца!
Прыбягайце ўранку
Вы да нас, да хаты.
Мы дадзім вам санкі,
Санкі-самакаты.



1. Які настрой выклікаў у вас гэты верш? Чаму?
2. Пра які момант з жыцця дзяцей апавядаецца ў творы?
3. На колькі сэнсавых частак можна падзяліць верш? Чаму вы так думаеце?
4. Як выглядае зімовая прырода? Прачытайце адпаведныя радкі.
5. Што можна сказаць пра характар апавядальніка?
6. На якую тэму напісаны верш «На горцы»? *(Прырода, дружба, зімовыя забавы.)*
7. У якім тэмпе — хуткім, сярэднім ці павольным — патрэбна чытаць кожную сэнсавую частку твора? Чаму?



Правообладатель Национальный институт образования

***Нараві́стая*** (гара) — не гладкая, а з выбоінамі, якая патрабуе ад дзяцей спрыту, смеласці ў час катання з яе.

***Узя́ць на буксі́р*** — дапамагаць каму-небудзь, хто адстае.

***Шпа́рка*** — хутка.

## З ГАРЫ

*Васіль Жуковіч*

Як садзіўся ехаць Санька
ля натоўпу дзетвары,
неяк выслізнулі санкі
і памчаліся з гары.

Доўга чуўся дружны смех,
што не ехаў Санька — бег.

Потым выйшла так, што Санька
сам паехаў па лядку.
На гары ляжалі санкі,
спачывалі на баку.

Зноў усім была пацеха,
што на футры Санька з’ехаў.



Правообладатель Национальный институт образования

Ды знайшоўся камандзір —
добры сябра Федзя, —
узяў малога «на буксір»
і сказаў:
— Паедзем!

Шпарка ехалі сябры
з нараві́стае гары.



1. Пра каго расказвае паэт у вершы?
2. Чаму ўсе дзеці смяяліся з Санькі? Адказ пацвердзіце словамі з верша.
3. Хто дапамог Саньку?
4. Якімі словамі характарызуе паэт Федзю? Чаму?
5. Якія малюнкі зімовых забаў можна зрабіць да гэтага твора?
6. Як па-іншаму можна назваць верш «З гары»?



Правообладатель Национальный институт образования

На форзацы 2 разгледзьце рэпрадукцыі карцін беларускіх мастакоў: «Ціхі вечар» Эдуарда Рымаровіча і «Лютаўскі дзень» Віктара Каралёва.

Адкажыце на пытанні.

1. Якая з прапанаваных карцін вам спадабалася больш? Чаму?
2. Што адлюстраваў мастак на палатне, якое вам спадабалася? Пералічыце ўбачанае.
3. Якія колеры падабралі аўтары для сваіх карцін? Як гэта дапамагае перадаць настрой?
4. Якімі адценнямі пераліваецца снег?
5. Што з паказанага прыцягвае вашу ўвагу? Чаму?
6. Чаму мастакі менавіта так назвалі свае палотны? Паразважайце.

## Скорагаворка

Скрып,
скрып,
скрып,
Снег ад холаду ахрып.
У яго, напэўна, грып.

*Генадзь Куняўскі.*



Правообладатель Национальный институт образования

***Каташкі́*** — коцікі, суквецце на вярбе, бярозе.
***Пала́савацца*** — з’есці што-небудзь смачнае.
***Растрыбу́шаная*** *(шышка)* — растрэсеная, з якой дасталі насенне.

## ПАД НОВЫ ГОД

*Павел Ткачоў*

Прачнуўся Дзед Мароз, паглядзеў навокал — сонейка зайшло, вечарэе.

— Вось бяда дык бяда, ледзь не праспаў, а сёння апошні дзень старога года, — бурчаў сам на сябе Дзед. — Працы ж у мяне, бацюхны мае́...

Дзед Мароз узяў кій, вялікі мех і пайшоў па снягах-сумётах. Па кары дрэў пастуквае, з галінак кіем снег збівае, з пня на пянёк пераскоквае.

Неўзабаве на лясную палянку выйшаў. На самай сярэдзіне паляны стаіць бяроза. Спыніўся Дзед каля яе крыху адпачыць.


Правообладатель Национальный институт образования

Глядзіць, а каля бярозы ямкі ў снезе. Гэта цецерукі. Днём наеліся бярозавых каташкоў, а пад вечар — бултых з галін проста ў снег.

Падзьмуў Мароз — замяла завіруха-мяцеліца. Праз хвіліну не засталося ад ямак і следу. Роўнае месца. Цёпла цецерукам — ніякі холад не страшны ім. А каб цецерукі маглі раніцай добра паласавацца, розных ягад — і брусніц, і чарніц — накідаў стары вакол бярозы на снезе.

Непадалёк ад бярозы расла старая-старая сасна з дуплом.

Зазірнуў Мароз у дупло, а там вавёрка ў шэрым футры спіць ды яшчэ хвосцікам, быццам коўдрай, накрылася — добра ёй!

— Ну і хітруха, — здзівіўся стары. — Чым жа яе пачаставаць?

Ведаў Дзед, што вавёркі вельмі любяць шышкі ды арэхі. Падзьмуў ён халодным марозным ветрам на сасну — патрэскаліся шышкі. А з іх насенне вось-вось пасыплецца — смачнае-смачнае. Бяры і еш.



Правообладатель Национальный институт образования

А потым Мароз дастаў з меха арэхаў і насыпаў у дупло.

Толькі хацеў ісці стары, аж раптам бачыць: каля другой сасны растрыбушаныя шышкі валяюцца.

— Хто ж гэта тут без мяне гаспадарыў? — ледзь не закрычаў Мароз. Але тут жа ўспомніў:

— Гэта ж работа стракатага дзятла — доктара тутэйшых дрэў.

Дзятла Дзед вельмі паважаў за яго працавітасць. Пагрукаў Мароз кіем па камлі сасны — пасыпаліся шышкі.

— Вось табе, стракаты, навагодні падарунак, — прамовіў Дзед і падаўся далей.

Па дарозе прыкмеціў пад кусцікам зайку. Ціхенька размёў каля яго снег, паклаў з меха капусных лісцікаў ды моркаўку.

— Пала́суйся і ты, касавокі!

Прачнуліся ранічкай на Новы год птушкі і звяркі, і кожны знайшоў для сябе нешта смачнае. Яны частаваліся, але не ведалі, хто гэта паклапаціўся аб іх, бо



Правообладатель Национальный институт образования



Дзеда Мароза ні ў лесе, ні ў полі ўжо не было.

Ён у гэты час раздаваў падарункі хлопчыкам і дзяўчынкам. А потым доўга-доўга вадзіў з імі каля ёлкі навагодні карагод.



1. Хто раздаваў падарункі жывёле ў лесе? Што вы даведаліся пра галоўнага героя?
2. Каму з лясных жыхароў Дзед Мароз даваў падарункі? Прачытайце адпаведныя радкі з твора.
3. За што Дзед Мароз паважаў дзятла?
4. Ці можна гэты твор назваць казкай? Дакажыце.
5. Якія ілюстрацыі зрабілі б вы да твора?



Правообладатель Национальный институт образования

## Маўленчая размінка

Прачытайце скорагаворкі Васіля Жуковіча, правільна вымаўляючы гукі [ц’], [дз’].

### Снежань

У снежні сняжынкі
занеслі **сц**яжынкі.

### Студзень

Воды студзень студзі**ць**,
Лёд ля студні будзе.

### Люты

На**дзь**муты люты **дзь**ме.
Ну, дзе канец зіме?





Правообладатель Национальный институт образования

***Бухма́тыя** (сняжынкі)* — пышныя, пушыстыя.
***Катушо́к*** — адгароджанае месца ў хляве.
***Пу́ня*** — вялікая халодная буды́ніна для захоўвання сена.

## АНДРЭЙКА-ПАМОЧНІК

*Янка Галубовіч*

Сумна Андрэйку аднаму ў хаце. Бацькі́ на рабоце, а ў яго — зімовыя канікулы.

За акном па́даў снег. Андрэйка доўга глядзеў, як прыліпаюць да шыбы бухматыя сняжынкі. У снежнай завірусе паступова знікаюць абрысы далёкага лесу.

Пасля абеду хлопчык зноў глянуў у акно і вачам сваім не паверыў: рэдкія сняжынкі кружыліся ў паветры. Але снегу намяло — па калені!

Доўга не думаючы, Андрэйка абуў валёнкі, апрануў паліто і выйшаў на двор. Схадзіў у пуню па невялікую драўляную ла-



Правообладатель Национальный институт образования

пату. І ўзяўся за работу. Спачатку прачысціў дарожку да хлява, потым да студні.

Пад валёнкамі ціха паскрыпваў снег, ветрык апякаў твар. Але Андрэйка не зважаў на гэта. Ён працаваў.

Скончыў адкідваць снег на сваім падворку, успомніў пра бабку Агату, суседку іхнюю. Вунь яе хата, насупраць стаіць, на дзвярах — замок. Ускінуў на плячо лапату і цераз вуліцу падаўся на бабчын двор.

А там вышэй Андрэйкі снежная гу́рба ўздыбілася. Ледзь з ёй справіўся, параскідаў снег у бакі́. Потым каля хлеўчука парадак навёў. Хацеў ужо дамоў ісці, як пачуў, што ў хлеўчуку каза замэкала. Наскуб са стажка сена і казе ў катушок укінуў.

Вечарам да іх завітала бабка Агата. Акінула вачыма хату, прысела на ўслон і спытала:

— А дзе ж Андрэйка, памочнік мой?

— Спіць ужо, — адказала маці.

— Ведама ж, напрацаваўся гэтак! Каб не Андрэйка, то я і ў двор свой не зайшла б,



Правообладатель Национальный институт образования

так намяло. Яшчэ і казу маю пакарміў. Во, гасцінца яму прынесла...

Бабка Агата дастала з кішэні і паклала на стол дзве вялікія антонаўкі.

1. Дзе, у горадзе ці вёсцы, жыў Андрэйка? Падмацуйце сваю думку радкамі з тэксту.
2. Чым спадабаўся вам герой апавядання?
3. Ці лёгка было Андрэйку ачышчаць ад снегу свой двор і двор бабкі Агаты? Якія радкі твора сведчаць пра гэта? Прачытайце іх.
4. Чаму Янка Галубовіч назваў гэта апавяданне «Андрэйка-памочнік»? Вызначце адносіны аўтара да Андрэйкі.
5. Што хацеў сказаць чытачам аўтар твора?
6. На колькі сэнсавых частак можна падзяліць апавяданне? Падбярыце загалоўкі да кожнай з іх. Падрабязна перакажыце змест твора.

## Загадка

Белым пухам замяло<br>
І палеткі, і сяло...<br>
Мост праз рэчку хутка ляжа.<br>
А што гэта, хто адкажа?

*Уладзімір Мацвеенка.*



Правообладатель Национальный институт образования

***Стру́нкія*** (галінкі) — тонкія, як струна.

## ЗА ШТО ЛЮБЛЮ Я НОВЫ ГОД?

*Валянцін Лукша*



За што люблю я
Новы год?..

За белы снег ля ганка,
Сняжынак сонечны палёт,
Палёт з гары на санках.

За што люблю я
Новы год?..

Канікулы ён дорыць
І мора радасных турбот —
Забаў і гульняў мора.

За што люблю я
Новы год?..



Правообладатель Национальный институт образования

За бляск ялінак стрункіх,
За наш вясёлы карагод,
А больш…
За падарункі.





1. За што герой верша любіць Новы год? Пацвердзіце сваю думку адпаведнымі радкамі з верша.
2. Ці згодны вы з яго думкамі? Чаму?
3. Знайдзіце ў гэтым творы радкі, якія паўтараюцца.
4. Які настрой хацеў перадаць паэт Валянцін Лукша ў сваім вершы?
5. Знайдзіце ў творы выразы, якія выклікаюць у чытача радасць, вясёлы настрой. Прачытайце іх.
6. Вывучыце верш на памяць.

## Правер свае дасягненні па тэме «Зімовыя прыгоды»

***Ведаю…***

1. У якіх творах так апісаны зімовыя карціны?



Правообладатель Национальный институт образования

а) «Мароз намаляваў на шы́бах акон сваé дзівосныя белыя ўзоры, рассыпаў вясёлыя агеньчыкі. Шуміць за сцяной вецер, гудзе-падвывае ў коміне»;
б) «За акном падаў снег. Андрэйка доўга глядзеў, як прыліпаюць да шыбы бухматыя сняжынкі. Як паступова знікаюць у снежнай завірусе абрысы далёкага лесу»;
в) Як садзіўся ехаць Санька
ля натоўпу дзетвары,
неяк выслізнулі санкі
і памчаліся з гары.

2. Хто сказаў гэтыя словы? Назавіце персанажа твора.

а) «Каб не Андрэйка, то я і ў двор свой не зайшла б, так намяло. Яшчэ і казу маю пакарміў. Во, гасцінца яму прынесла...»;
б) «Вось бяда дык бяда, ледзь не праспаў, а сёння апошні дзень старога года... Працы ж у мяне — бацюхны мае...»;


Правообладатель Национальный институт образования

в) — Якую ж вам казку расказаць? — пытае бабулька. — Раскажу вам хіба пра маленькіх казачных чалавечкаў. Ну дык вось, слухайце. Жыў ды быў на свеце адзін шавец, — пачала сваю казку бабуля. — І так ён збяднеў, так збяднеў, што застаўся ў яго толькі невялікі кавалак скуры. «Вы́краю я з гэтай скуры па́ру чараві́каў, а заўтра раніцай вазьмуся за шытво», — падумаў шавец і лёг спаць.

3. З якіх вершаў узяты радкі?

а) З першым снегам,
З першым снегам,
Не сядзіцца дзетвары.
Звонкім смехам,
Звонкім смехам
Напаўняюцца двары;

б) За што люблю я
Новы год?..
Канікулы ён дорыць
І мора радасных турбот —
Забаў і гульняў мора;



Правообладатель Национальный институт образования

в) Як у небе зоркі,
Снег вакол іскрыцца.
Эх, на санках з горкі
Хораша пусціцца!

4. Які настрой вершаў «З першым снегам!» Юрася Свіркі, «На горцы» Алеся Ставера і «З гары» Васіля Жуковіча?

*Разумею, магу растлумачыць...*

1. Якія творы з раздзела «Зімовыя прыгоды» вам найбольш спадабаліся? Назавіце іх.

2. Якая асноўная думка заключана ў апавяданні Янкі Галубовіча «Андрэйка-памочнік»?

2. Аб чым хацелі паведаміць нам паэты Юрась Свірка ў вершы «З першым снегам!» і Васіль Жуковіч у вершы «З гары»?

3. Чаму вучыць нас Дзед Мароз з казкі Паўла Ткачова «Пад Новы год»?

*Умею...*

1. Чытаць на памяць верш Валянціна Лукшы «За што люблю я Новы год?».



Правообладатель Национальный институт образования

2. Падрабязна пераказваць змест апавяданняў «Андрэйка-памочнік» Янкі Галубовіча і «Пра казачных чалавечкаў» Ядвігі Бяганскай.

### *Гульня «Навядзіце парадак»*

Дапамажыце мастаку правільна назваць прозвішчы аўтараў твораў, да якіх зроблены малюнкі.





*Алесь Ставер*
*Ядвіга Бяганская*
*Павел Ткачоў*



Правообладатель Национальный институт образования

# ЗМЕСТ


## Вераснёвы школьны ранак

Першага верасня. *Міхась Пазнякоў* ...... 5
Навука чытання. *Ганна Лукашэвіч* ...... 7
Каток. *Адам Гурыновіч* ...................... 11
Як Мікітка сукенку з'еў. *Мікола Чарняўскі* 13
Мае сябры. *Васіль Жуковіч* ................. 17
*Правер свае дасягненні па тэме «Вераснёвы школьны ранак»* ............... 19

## Восеньскія гісторыі

Маладая восень. *Васіль Жуковіч* .......... 24
Верасень. *Клаўдзія Каліна* .................. 27
Адлёт жураўлёў. *Якуб Колас* ............... 30
Восень. *Якуб Колас* ............................ 34
Грыбнік. *Рыгор Ігнаценка* ................... 39
Песенька. *Галіна Каржанеўская* .......... 43
*Правер свае дасягненні па тэме «Восеньскія гісторыі»* ......................... 45

## У свеце ветлівасці і дабрыні

Падзяка. *Павел Кавалёў* ...................... 48
Чатыры пажаданні. *Васіль Вітка* ......... 50
Каму сказаць дзякуй? *Ядвіга Бяганская* 52
Жук і слімак. *Максім Танк* ................. 56




Правообладатель Национальный институт образования

Гутарка асоту з крапівою. *Цётка* ......... 60
Чаму мяне не хваляць. *Іван Муравейка* 62
Кропелька. *Яраслаў Пархута* ............ 64
Добрыя дзеці. *Алесь Гарун* ................. 69
Выратаваў. *Ніна Галіноўская* ............... 72
*Правер свае дасягненні па тэме*
*«У свеце ветлівасці і дабрыні»* ............ 74

## Падарожжа ў свет казкі

Як курачка пеўніка ратавала ............... 79
Пшанічны каласок ................................ 84
Коцік, Пеўнік і Лісіца ......................... 93
Ганарыстая варона ................................ 99
Два маразы *(у апрацоўцы Я. Коласа)* .... 104
*Правер свае дасягненні па тэме*
*«Падарожжа ў свет казкі»* ................... 109

## Зімовыя прыгоды

З першым снегам! *Юрась Свірка* ........... 114
Пра казачных чалавечкаў. *Ядвіга Бяганская* 118
На горцы. *Алесь Ставер* ...................... 122
З гары. *Васіль Жуковіч* ...................... 124
Пад Новы год. *Павел Ткачоў* ................ 127
Андрэйка-памочнік. *Янка Галубовіч* ..... 132
За што люблю я Новы год? *Валянцін Лукша* 135
*Правер свае дасягненні па тэме*
*«Зімовыя прыгоды»* ............................. 136



Правообладатель Национальный институт образования

Вучэбнае выданне

**Жуковіч** Мікалай Васільевіч

**ЛІТАРАТУРНАЕ ЧЫТАННЕ**

Вучэбны дапаможнік для 2 класа
ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання

У дзвюх частках
Частка 1
2-е выданне, перапрацаванае і дапоўненае

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *С. П. Маляўка*
Рэдактар *Л. Ф. Леўкіна*
Мастакі *І. В. Лазерка, А. А. Ламанава, К. У. Максімава, Л. А. Пастушэнка, Л. М. Рудакоўская, А. С. Сідорына, Н. А. Хромава*
Вокладка мастака *А. П. Пратасені*
Мастацкі рэдактар *З. П. Болцікава*
Камп'ютарная вёрстка *А. М. Кісялёва*
Карэктары *Г. М. Мазіна, І. М. Дабрыдзень*

Падпісана да друку 06.07.2022. Фармат 70×90 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 10,53. Ул.-выд. арк. 4,5.
Тыраж 14 068 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка
друкаваных выданняў № 1/263 ад 02.04.2014.
Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

Адкрытае акцыянернае таварыства «Паліграфкамбінат імя Я. Коласа».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/3 от 10.09.2018.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск

Правообладатель Национальный институт образования

(Назва ўстановы адукацыі)

| Навучальны год | Імя і прозвішча вучня | Стан вучэбнага дапаможніка пры атрыманні | Адзнака вучню за карыстанне вучэбным дапаможнікам |
|---|---|---|---|
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |
| 20 / | | | |

Правообладатель Национальный институт образования